Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 СНЕЖНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 236 (29103)

«Я ЖЫВУ З ХВАРОБАЙ ПАРКІНСОНА»

Сямейная газета

АДДАЦЬ ДЗІЦЯ Ў СПОРТ ПРАВІЛЬНА

Сямейная газета

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег МАКАРАЎ, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў:

«Беларусі важная ўвага, якую цяпер праяўляе да яе на міжнароднай арэне сусветная супольнасць. Яе можна манетызаваць у плане турызму, інвестыцый, палітычных дывідэндаў. Наша краіна ўжо выкарыстоўвала сваё пападанне ў фокус, каб прасунуць шэраг мірных ініцыятыў з нагоды «Хельсінкі-2», стварэння пояса лічбавага добрасуседства, і яны пачутыя на міжнароднай арэне. У той жа час увага, якую сусветная супольнасць праяўляе да той ці іншай краіны, цыклічная. Ёсць такое паняцце, як мода: будуць модныя іншая тэма, іншая дзяржава. Але Беларусі важна захоўваць баланс, бо мода на яе звязана ўсё ж такі не з турызмам, а з удзелам у вялікім палітычным працэсе. І вельмі небяспечна ў гэтай гісторыі стаць сродкам, з суб'екта ператварыцца ў інструмент».

КАРАТКА

• Намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка ў Лепельскім раёне правёў выязное пасяджэнне рабочай групы па пытаннях сацыялізацыі асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

• **Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны з Барбадосам.**

• Да канца года ў Магілёўскай вобласці будуць павышаны тарыфы на гарадскія і прыгарадныя перавозкі.

• **Хакеісты зборнай Беларусі ў другім матчы маладзёжнага чэмпіянату свету ў першым дывізіёне саступілі камандзе Латвіі з лікам 2:3.**

• Жыхар Стоўбцаў з рэўнасці падпаліў машыну новага выбранніка былой жонкі, аўто цалкам згарэла.

Час маладых

ПРАЗ ДУМЫ АБ БАГДАНОВІЧУ ДА ПЕРАМОГІ

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У сталіцы выбралі «Студэнта года — 2019»

У Мінскім дзяржаўным палацы культуры прайшоў фінал рэспубліканскага конкурсу БРСМ «Студэнт года — 2019». Запаветны тытул атрымала студэнтка чацвёртага курса факультэта славянскіх і германскіх моў Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Дар'я ПАЎЛОЎСКАЯ *(на фота)*. Сёлета на яго прэтэндавалі 270 юнакоў і дзяўчат 44 навучальных устаноў. Пасля паўсотні адборачных тураў у фінале свае здольнасці прэзентавалі дзесяць удзельнікаў, якія вядуць актыўнае грамадскае жыццё, з'яўляюцца стыпендыятамі спецыяльных фондаў, удзельнікамі навуковых канферэнцый, прадметных алімпіяд, конкурсаў, спаборніцтваў, фестываляў і маюць сярэдні бал у вучобе, не ніжэйшы за 8,5.

Грандыёзная падзея распачалася хвалюючым для выступоўцаў этапам «Будзем знаёмыя». Умова — паказаць сябе і сваю навучальную ўстанову найярчэйшым і найцікавейшым чынам. Таленты студэнтаў ацэньвалі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, артысты, рэжысёры, тэлевядучыя і па сумяшчальніцтве педагогі — тыя, хто перадаваў свой вопыт фіналістам на майстар-класах.

Так, Лізавета АБРАМКІНА, другакурсніца факультэта камерцыі і турыстычнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, расказала пра свае мэты, мары і любоў да сям'і праз цікавы аповед, які суправаджаўся лірычнай мелодыяй на фартэпіяна. «Наша жыццё — гэта музыка. У кожнага яна складаецца са сваіх нот. А якая яна, мая музыка?»... Дзевятнаццацігадовы студэнт другога курса факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Кірыл ГРОМАЎ падарыў гледачам добры настрой праз палымяныя танцы, а таксама салодкі пірог для ўсіх ахвотных. Трэцякурсніца Іна КЛЯЧАН, курсантка факультэта міліцыі Магілёўскага інстытута Міністэрства ўнутраных спраў, здзівіла прысутных феерычным шоу, чацвёртакурснік агранамічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Арцём НЕСЦЯРУК і студэнт трэцяга курса ўлікова-фінансавага факультэта Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі Дзмітрый БЕРАЗОЎСКІ прадэманстравалі міні-інсцэніроўкі ў духу КВЗ.

СТАР. 13

Квадратны метр

БЕЗ ЗНАЧНЫХ УЗРУШЭННЯЎ

Наш аналітык упэўнены, што ў Мінску павышэнне цаны будзе не большым, чым паказчык інфляцыі. А што ў сталіцы — тое і ў рэгіёнах

Яшчэ ў пачатку года адзін мой бескватэрны знаёмы быў упэўнены, што вось-вось у сталіцы пачнецца масавае патанненне жылля на другасным рынку. Мне ж спецыялісты рынку нерухомасці казалі аб зусім іншай тэндэнцыі. Напрыклад, наш эксперт Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ, ганаровы старшыня Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктар агенцтва нерухомасці ЦТН, прадказваў нязначнае (не больш за 5-6 працэнтаў) плаўнае падаражэнне ўсіх відаў кватэр на рынку нерухомасці Мінска. Спецыяліст тады не памыліўся: так прыкладна і паводзіў сябе рынак на працягу года. Што чакае нас на рынку жылля ў завяршальным месяцы і потым у новым сезоне? Пра гэта мы з Мікалаем Паўлавічам вырашылі пагаварыць досыць падрабязна.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Права для абароны

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 449 «Аб удасканаленні дзяржаўнага рэгулявання ў галіне абароны інфармацыі». Пра гэта паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Дакумент распрацаваны ў мэтах актуалізацыі прававых асноў тэхнічнай і крыптаграфічнай абароны інфармацыі ў Беларусі, стварэння эфектыўнай нарматыўнай прававой базы для аднясення аб'ектаў інфарматызацыі да крытычна важных, забеспячэння кіберустойлівасці крытычна важных аб'ектаў інфарматызацыі (КВАІ), інфармацыйных сістэм, прадухілення дэструктыўных інфармацыйных уздзеянняў і іншых інфармацыйных пагроз. Указ накіраваны на далейшую рэалізацыю палажэнняў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і ўзаемазвязаны з Канцэпцыяй інфармацыйнай бяспекі.

Ва ўказе актуалізаваны асноўныя патрабаванні па забеспячэнні тэхнічнай і крыптаграфічнай абароны інфармацыі, удакладняюцца паўнамоцтвы дзяржаўных органаў, а таксама правы і абавязкі ўладальнікаў (уласнікаў) інфармацыйных сістэм і КВАІ. Акрамя таго, скарэкціраваны галіновыя крытэрыі аднясення аб'ектаў інфарматызацыі да крытычна важных. Гэтая мера дасць магчымасць дадаткова ўключыць у Дзяржаўны рэестр крытычна важных аб'ектаў інфарматызацыі шэраг аб'ектаў паліўна-энергетычнага комплексу, прамысловага і фінансавага сектараў, сферы транспарту і камунікацый, ЖКГ, аховы здароўя і адукацыі.

Рэалізацыя мер, прадугледжаных ва ўказе, дазволіць дзяржаве павялічыць бяспеку і надзейнасць інфармацыйна-камунікацыйных сетак і інфармацыйных сістэм.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Падтрымка маладых

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 10 снежня падпісаў два распараджэнні, якія падтрымліваць таленавітую моладзь. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным інтэрнэт-партале кіраўніка дзяржавы.

Першы дакумент зацвярджае рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. У адпаведнасці з дакументам, выдаткаваны амаль 157 тысяч рублёў на аплату 40 стыпендый, 37 прэмій, 52 заахвочвальных прэмій, 13 гранд-прэмій навучэнцам, студэнтам і творчым калектывам. Матэрыяльная дапамога аказана 153 прадстаўнікам таленавітай моладзі. Сярод іх — пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў у галіне музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога, выяўленчага, харэаграфічнага, харавога і мадэльнага мастацтва.

Другім распараджэннем кіраўніка дзяржавы прызначаны стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 99 маладым навукоўцам.

Стыпендыятамі сталі прадстаўнікі фізіка-матэматычных, тэхнічных, хімічных, біялагічных, медыцынскіх, аграрных, сацыяльных і гуманітарных навук. У іх ліку — восем дактароў навук, 60 кандыдатаў навук і 31 малады навуковец без ступені.

Дасягненні стыпендыятаў маюць навуковую значнасць, атрыманыя вынікі выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе і практычнай дзейнасці профільных арганізацый эканомікі або сацыяльнай сферы Беларусі, адзначаецца ў дакументе. Навізна даследаванняў пацверджана публікацыямі ў вядучых айчынных і замежных навуковых часопісах, па многіх распрацоўках атрыманы патэнты на вынаходствы.

Прыняцце распараджэння з'яўляецца сведчаннем падтрымкі дзяржавай навуковага пошуку і творчай ініцыятывы таленавітых маладых навукоўцаў, развіцця і амаладжэння навуковага патэнцыялу краіны, каментуе дакумент прэс-служба беларускага лідара.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Парламенцкі дзённік

Як абраныя дэпутаты зноў былі кандыдатамі

Ніжняя палата парламента ў поўным складзе ўчора на чарговым пасяджэнні абрала кіраўнікоў 14 Пастаянных камісій.

Старшынёй Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце стаў дэпутат Слонімскай акругі № 58 **Валянцін СЕМЯНЯКА**, уся працоўная дзейнасць якога звязана з Гродзенскай вобласцю. Дэпутат Аляксандр Сонгін адзначыў, што калега, апроч іншых вартасцяў, — творчая асоба, паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Сярод галоўных задач для сябе на пасадзе кіраўніка камісіі Валянцін Семяняка вызначыў павышэнне ролі органаў мясцовага кіравання ў забеспячэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, карэкціроўку закона аб дзяржаўнай службе і асабліва адказны этап — удзел у рабоце па ўдасканальванні Канстытуцыі.

Старшынёй Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы абраны дэпутат 6-га і 7-га скліканняў ад Брэсцкай-Заходняй акругі № 1 **Леанід БРЫЧ.** Прынцып работы парламентарыя — з людзьмі і для людзей. «З'яўляючыся выхадцам з бізнесу, ён добра разумее праблемы і чаканні гэтай часткі нашага грамадства», — паведаміў Анатоль Дашко, прадстаўляючы калегу.

Паляпшэнне ўмоў для вядзення бізнесу, узмацненне гарантый прававой прыватнай уласнасці, павышэнне эканамічнай эфектыўнасці дзяржаўных арганізацый, стымуляванне інвестыцыйнай актыўнасці прапанаваў Леанід Брыч у якасці мэт камісіі на будучыя гады.

Мікалай ШАЎЧУК (Полацкая сельская акруга № 28), які больш за 30 год працуе ў аграрнай галіне, выбраны дэпутатамі на пасаду **старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.** Задачамі для яе ён вызначыў увагу да арганічнай сельскай гаспадаркі, падтрымку беларускіх вытворцаў-экспарцёраў, падрыхтоўку дакументаў па забеспячэнні харчовай бяспекі, мадэрнізацыю эканомікі сяла.

Пастаянную камісію па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі ўзначаліў Генадзь ДАВЫДЗЬКА ад Усходняй акругі № 107. Яго прадставіла Лілія Ананіч, якая ахарактарызавала калегу як таленавітага акцёра, журналіста, дзяржаўнага кіраўніка. «Актуальныя застаюцца шматлікія тэмы, якія датычацца гендарных пытанняў, правоў чалавека, прафесійнага асяроддзя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Другой актуальнай задачай з'яўляецца маніторынг дзеючага заканадаўства і яго правапрымяняльнай практыкі», — абазначыў Генадзь Давыдзька свае дэпутацкія прыярытэты. Важным момантам стане ўзаемадзеянне па праблеме правоў чалавека сумесна з міжнароднымі арганізацыямі.

Пастаянную камісію па працы і сацыяльных пытаннях узначаліць Людміла КАНАНОВІЧ (Маладзечанская гарадская акруга № 72). Арыенцірамі ў дзейнасці дэпутата і яе камісіі будуць карэкціроўка заканаў па занятасці, работа над практыкай сацыяльнага страхавання, падрыхтоўка канцэпцыі закона аб ветэранах, абарона і падтрымка інвалідаў.

Адказваць за дзейнасць **Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі будзе Ігар КАМАРОЎСКІ** (Паўднёва-Заходняя акруга № 99). Сур'ёзнага перагляду адносін у гэтай галіне патрабуе ўвод у эксплуатацыю Беларускай атамнай станцыі. «Неабходна зрабіць усё, каб Беларусь стала галоўным транспартным калідорам і вядучым лагістычным хабам Еўропы і магла ў поўнай меры рэалізаваць свой транзітны патэнцыял», — лічыць дэпутат.

Над парламенцкай дыпламатыяй будзе працаваць **Пастаянная камісія па міжнародных справах на чале з Андрэем САВІНЫХ** (Чкалаўская акруга № 96). Перад ім стаіць задача захаваць і памножыць дасягненні папярэднікаў на міжнародным вектары. Дэпутат валодае рангам Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла і раней працаваў кіраўніком дыпламатычнай місіі Беларусі ў Турцыі і Іраку па сумяшчальніцтве. Адносна ўдасканалвання заканадаўчай базы па міжнародных адносінах Андрэй Савіных расказаў: увага будзе ўдзяляцца ўступленню краіны ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, развіццю экспартнага патэнцыялу, рабоце ў міжпарламенцкіх арганізацыях і двухбаковаму супрацоўніцтву.

На пасаду **старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве** выбрана дэпутат ад Старавіленскай выбарчай акругі № 105 **Святлана ЛЮБЕЦКАЯ**. Яе кандыдатуру прадставіў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый Міцкевіч, адзначыўшы, што кандыдат — прафесійны юрыст, які са стажора «дарос» да суддзі Вярхоўнага суда. Рэалізавала сябе і ў выкладчыцкай дзейнасці на юрыдычным факультэце БДУ.

На пасаду **старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы** выбраны дэпутат ад Пухавіцкай выбарчай акругі № 65 **Алег БЕЛАКОНЕЎ**, прафесійны ваенны. Дэпутат Ігар Мартынаў паведаміў, што Алег Белаконеў удзельнічаў у падрыхтоўцы і рэалізацыі прапаноў па фарміраванні дзяржаўнай палітыкі ў галіне абароны. Пад яго кіраўніцтвам у бытнасць начальнікам Генштаба падрыхтавана Ваенная дактрына Беларусі.

Сам Алег Белаконеў заявіў, што заканатворчая дзейнасць будзе накіравана на ўдасканаленне рэгулявання грамадскіх адносін у сферы абароны і нацыянальнай бяспекі, ліквідацыю прабелаў у пытаннях абароны нацыянальных інтарэсаў краіны, асабліва стратэгічных, ад якіх залежыць само існаванне дзяржавы.

Пастаянную камісію па бюджэце і фінансах узначаліла дэпутат ад Капыльскай выбарчай акругі № 66 **Людміла НІЖЭВІЧ**. Яна выказала задавальненне, што ў гэтым скліканні працуе шмат профільных спецыялістаў, што, на яе думку, дазволіць паспяхова выканаць асноўную работу — рэгуляванне фінансавых інстытутаў.

На пасаду **старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы** абралі дэпутата ад Буда-Кашалёўскай выбарчай акругі № 38 **Мікалая ВАСІЛЬКОВА**, які ўвесь час пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі працаваў у рэгіёне, больш за ўсё пацярпелым ад радыеактыўнага забруджвання, а ў шостым скліканні быў намеснікам старшыні гэтай камісіі.

На пасаду **старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве** дэпутат Мікалай Шаўчук прапанаваў кандыдатуру дэпутата па Віцебскай-Горкаўскай выбарчай акрузе № 17 **Віктара МІКАЛАЙКІНА**, лаўрэата пачэснага звання «Чалавек года Віцебшчыны», кавалера Ордэна Пашаны. Віктар Мікалайкін падкрэсліў, што ў сёмым скліканні давядзецца працягнуць работу па ўдасканаленні заканадаўства ў галіне рэкламы, пахавальнай справы, у галіне развіцця гарадоў і вёсак, добраўпарадкавання, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і аблічча новых жылых мікрараёнаў. У прыватнасці, дэпутат адзначыў, што неабходна спрасціць патрабаванні да многіх інстытутаў у будаўніцтве і мінімізаваць адміністрацыйныя працэдуры.

Кіраўніком Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы стала дэпутат ад Грушаўскай акругі № 98 **Людміла МАКАРЫНА-КІБАК.** Яна працягвае парламенцкую работу з мінулага склікання, у тым ліку ў якасці старшыні гэтай камісіі. За гэты час падрыхтавана больш за дзесяць законапраектаў, паведаміла дэпутат Валянціна Курсевіч. На словах спікера, Людміла Макарына-Кібак практычнай ахове здароўя аддала больш за чвэрць стагоддзя і дасягнула вяршынь у прафесіі.

Гісторык, археолаг, краязнавец, педагог Ігар МАРЗАЛЮК (Магілёўская-Ленінская акруга № 84) заклікаў краіну да рэвалюцыі — навукова-тэхналагічнай. Ён узначаліў **Пастаянную камісію па адукацыі, культуры і навуцы.** Дэпутат таксама запрасіў калег у кіно, каб вывучыць праблемы і вырашыць іх на заканадаўчым узроўні, нагадаўшы, што 17 снежня айчыннаму кінематографу спаўняецца 95 год.

Ігар Марзалюк падкрэсліў, што ў сёмым скліканні народным выбранніком давядзецца працаваць над новай рэдакцыяй кодэксаў аб адукацыі і культуры, удасканальваць законы аб архіўнай і выдавецкай справах. А яшчэ дэпутат паабяцаў імкнуцца, каб найважнейшыя гістарычныя, археалагічныя, архітэктурныя помнікі, якія патрабуюць тэрміновай рэстаўрацыі ці кансервацыі, былі ўключаны ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму.

Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.

Палата прадстаўнікоў выбрала старшынь Пастаянных камісій

НА АЭС ПАЧАЛІ ГАРАЧУЮ АБКАТКУ РЭАКТАРА

Фота БелТА.

Гэта самы маштабны этап пусканаладачных работ перад фізічным пускам рэактарнай установкі. Тэхналагічны працэс, распачаты на першым энергаблоку беларускай АЭС, імітуе сапраўдную работу. Толькі замест цеплавыдзяляльных зборак у рэактар загружаны іх імітатары.

Падчас гарачай абкаткі спецыялісты правераць працаздольнасць асноўнага абсталявання энергаблока на адпаведнасць патрабаванням па эксплуатацыі і бяспецы. Апрабуюць таксама сістэмы аховы першага і другога контураў ад перавышэння ціску і правядуць іспыты работы галоўных цыркуляцыйных помпаў на халодных і гарачых параметрах рэактарнай установкі.

У праграму іспытаў уваходзіць таксама праверка сістэмы электрасілкавання ўласных патрэб пры рэжымах перарывання і поўнага абясточвання энергаблока з мадэляваннем сітуацыі максімальнай праектнай аварыі.

— Мы выйшлі на фінішную прамую праграмы падрыхтоўкі энергаблока да фізічнага запуску, — паведамляе **дырэктар праекта па стварэнні Беларускай АЭС інжынірынгавай кампаніі АСЭ Віталь ПАЛЯНІН.** — Наступны этап пасля гарачай абкаткі — рэвізія асноўнага і дапаможнага абсталявання першага і другога контураў энергаблока.

Ірына СІДАРОК.

З УЛІКАМ НОВАЙ МЕДЫЙНАЙ РЭАЛЬНАСЦІ

Учора ў Гродне прайшоў семінар «Рэгіянальныя СМІ ў эпоху лічбавізацыі: новыя фарматы і канкурэнтаздольнасць на медыярынку». Як правіла, падобныя мерапрыемствы носяць практычны характар. Намеснікі старшынь гар- і райвыканкамаў, кіраўнікі дзяржаўных рэгіянальных СМІ, начальнікі аддзелаў ідэалагічнай работы і па справах моладзі райвыканкамаў, а таксама эксперты ў сферы камунікацыі, якія ў іх удзельнічаюць, дзеляцца думкамі, даюцца канкрэтныя парады па павышэнні эфектыўнасці работы рэгіянальных СМІ.

Фота БелТА.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ, у прыватнасці, адзначыў узрастанне ролі рэгіянальных медыя ў фарміраванні інфармацыйнага парадку: мясцовыя СМІ акцэнтуюць увагу на праблемах, якія хвалююць людзей, дапамагаюць мясцовай уладзе ў наладжванні зваротнай сувязі з насельніцтвам. Пры гэтым СМІ павінны працаваць перш за ўсё ў запатрабаваных у чытача і гледача фарматах — месенджарах, сацыяльных сетках. Важна стварыць уласнае дыскусійнае поле, уцягваць аўдыторыю ў працэс абмеркавання. «Неабходна паслядоўна і інтэнсіўна перабудоўваць свае творчыя падыходы і бізнес-мадэлі з улікам новай медыйнай рэальнасці», — адзначыў Андрэй Кунцэвіч. Пры гэтым важна ўдзяліць увагу фарміраванню ў аўдыторыі інфармацыйнай гігіены і імунітэту да фэйкаў.

У сваю чаргу, **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** лічыць: «Галоўная задача медыя незалежна ад іх фармату — адлюстраванне таго часу, які мы бачым, з усімі цяжкасцямі і праблемамі. Пры гэтым удзельнікі медыйнага працэсу павінны разумець, што расказваць трэба і праўдзіва, і так, каб у далейшым паўплываць на змяненне сітуацыі ў лепшы бок». Яшчэ адна важная задача СМІ — выбудоўванне нармальнага дыялогу інстытутаў улады і грамадства, пастаяннае пашырэнне прасторы такіх зносін. Аляксандр Карлюкевіч падкрэсліў, што ў гэтай рабоце неабходна перш за ўсё арыентавацца на запыты чытача і гледача.

Паводле БелТА.

Падзея

НАВУКА ПРА КІНО

Святкаванне юбілею айчыннага кінематографа пачалося з лекцый

Непрыкметна беларускае кіно прыйшло да значнага юбілею: 17 снежня стварэнню інстытуцыі «Белдзяржкіно» пры народным камісарыяце асветы БССР споўніцца 95 гадоў. Каб даследаваць і прааналізаваць мінулае і сучаснасць нацыянальнай кінематаграфіі, на «Беларусьфільме» і ў Акадэміі навук праходзіць двухдзённая навукова-практычная канферэнцыя, што аб'ядноўвае акадэмікаў і рэжысёраў, замежных кіназнаўцаў і айчынных кінадзеячаў.

На ўчарашні дзень прыйшліся лекцыі выключна запрошаных спецыялістаў з Масквы і Санкт-Пецярбурга, прысвечаныя больш агульным за нацыянальнае кіно пытанням. Сёння ж пасля ўрачыстага адкрыцця канферэнцыі — яна носіць назву «95 гадоў беларускаму кіно: гісторыя, сучаснасць, перспектывы» — у Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук і на «Беларусьфільме» будзе прачытана 48 дакладаў на любы густ.

Перад слухачамі выступяць беларускія кіназнаўцы і кінакрытыкі Антаніна Карпілава, Людмила Саянкова, Максім Карпіцкі; рэжысёры Вольга Дашук, Мікіта Лаўрэцкі, Вячаслаў Нікіфараў, дырэктар Музея гісторыі беларускага кіно Ігар Аўдзееў, праграмны дырэктар кінафестывалю «Лістапад» Ірына Дзям'янава, прадстаўнік Майстэрні сацыяльнага кіно і прадзюсар Канстанцін Варабей. Выступоўцамі будуць ахоплены беларускі кінематограф і яго кантэкст, яго гісторыя і сучасныя з'явы, ігравое, дакументальнае і анімацыйнае кіно.

Арганізатарамі канферэнцыі выступаюць Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Міністэрства культуры і кінастудыя «Беларусьфільм». Расклад мерапрыемстваў можна знайсці на сайце Акадэміі навук nasb.gov.by.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

На слыху

ЗАСЛОНА АДНАРАЗОВАМУ ПОСУДУ

Забарона на выкарыстанне і продаж некаторых відаў аднаразовага пластыкавага посуду будзе ўведзена ва ўстановах грамадскага харчавання. Такое рашэнне прыняў урад (пастанова Савета Міністраў № 797 ад 27 лістапада 2019 года). Які канкрэтна аднаразовы посуд трапіць пад забарону, цягам трох месяцаў вызначыць Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ). Змяненні ўвойдуць у сілу з 1 студзеня 2021 года.

— Рэалізацыя гэтага дакумента прывядзе да зніжэння выкарыстання аднаразовай палімернай упакоўкі, а таксама мінімізацыі яе ўплыву на навакольнае асяроддзе і здароўе насельніцтва. Гэта суадносіцца з Дырэктывай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 сакавіка 2019 года № 7, а таксама міжнароднымі тэндэнцыямі ў галіне абыходжання з пластыкам, — падкрэслівае **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ.**

На думку экспертаў цэнтра, асноўным крытэрыем для ўключэння тавару ў пералік забароненых для сектара грамадскага харчавання павінна быць немагчымасць яго паўторнага выкарыстання на працягу тэрміну прыдатнасці. Згодна з гэтым крытэрыем, Цэнтр экалагічных рашэнняў прапануе ўключыць у пералік забароненых наступныя прадметы:

- пластыкавыя памешвальнікі;
- пластыкавыя трубачкі;
- сашэ з цукрам, соллю і перцам (парцыйныя ўпакоўкі, якія ўтрымліваюць тонкі пласт пластыку);
- аднаразовы посуд і прыборы, асабліва з тыпаў пластыку, якія не перапрацоўваюцца ў Беларусі;
- аднаразовыя пластыкавыя кубачкі або шматслойныя аднаразовыя кубачкі, у склад якіх уваходзіць пластык.

Як адзначае Яўген Лабанаў, не менш важна сёння ўдзяліць належную ўвагу альтэрнатыве аднаразовым пластыкавым прадметам.

— Адсутнасць дакладных крытэрыяў для выбару альтэрнатыўных тавараў можа прывесці да з'яўлення іншых аднаразовых тавараў, раскладанне або перапрацоўка якіх будуць немагчымыя ў цяперашніх умовах. Асноўным крытэрыем павінна быць магчымасць іх шматразовага выкарыстання, — заўважае эколаг.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Чулі?

«ПАЎЛІНКА» ПАД АХОВАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Найстарэйшы спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Паўлінка», які значыцца ў рэпертуары з 1944 года, будзе ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі і такім чынам трапіць пад ахову дзяржавы. Адпаведнае пытанне было разгледжана ўчора на пасяджэнні адмысловай рады пры Міністэрстве культуры Беларусі.

Прапанову абаранялі артысты тэатра Арнольд Памазан, Марыя Захарэвіч, Марта Голубева, загадчыца літаратурна-драматургічнай часткі Купалаўскага Вольга Бабкова і генеральны дырэктар тэатра Павел Латушка.

«Гэта абсалютна натуральная і лагічная ініцыятыва, бо спектакль «Паўлінка» з'яўляецца класікай тэатральнага мастацтва Беларусі, яго ведаюць усе аматары беларускай культуры, і гэта сапраўдны брэнд Купалаўскага тэатра, — пракаментаваў Павел Латушка «Звяздзе», — «Паўлінка» — больш чым назва пастаноўкі: гэта творчае асэнсаванне, душа народа, геній класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. Мы ведаем гэты спектакль з дзяцінства, я і сам памятаю, як упершыню ўбачыў яго, калі прыйшоў у тэатр з бацькамі».

«Паўлінкай» адкрываецца і закрываецца кожны тэатральны сезон Купалаўскага, і гэта адзін з самых папулярных і любімых гледачамі спектакляў: толькі ў 2019 годзе, па словах Паўла Латушкі, пастаноўка адзначылася ў рэпертуары 29 разоў.

«Апроч іншага, «Паўлінка» з'яўляецца школай для купалаўцаў, — працягвае дырэктар тэатра. — Праз яе праходзяць фактычна ўсе маладыя артысты, шмат каго з іх на сцэне Купалаўскага чакаў яскравы творчы лёс, многія сталі народнымі і заслужанымі артыстамі краіны».

Рашэнне аб наданні спектаклю «Паўлінка» статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці было прынята сябрамі рады аднагалосна — цяпер яно мусіць быць зацверджана подпісам міністра, пасля чаго атрымае юрыдычную сілу.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Time назваў чалавека года

Чалавекам года па версіі амерыканскага часопіса Time стала 16-гадовая шведская актывістка Грэта Тунберг. Фота дзяўчыны, якая стаіць на беразе акіяна ў Партугаліі, супрацоўнікі выдання суправадзілі подпісам «Сіла юнацтва». «Мы не можам проста працягваць жыць так, як быццам заўтра не існуе, таму што яно ёсць», — цытуюць яны актывістку.

Школьніца Тунберг стала адным з лідараў сусветнага экалагічнага руху. У верасні 2019 года яна выступіла на саміце па клімаце ў ААН. У сваёй прамове дзяўчына абвінаваціла палітыкаў у тым, што яны пазбавілі яе пакаленне дзяцінства, таму што перадалі яму ўсе назапашаныя чалавецтвам праблемы, звязаныя са зменамі клімату, і пераклалі на яго плечы іх вырашэнне. Пасля свайго эмацыянальнага выступлення актывістка хутка стала гераіняй інтэрнэт-мемаў.

Некалькі дзён таму выданне Time апублікавала шорт-ліст прэміі. Туды ўвайшлі прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, старшыня КНР Сі Цзіньпін, прэм'ер-міністр Новай Зеландыі Джасінда Ардэрн, кіраўнік Facebook Марк Цукерберг, а таксама ўдзельнікі акцыі пратэсту ў Ганконгу.

Колькі расіяне жывуць на пенсіі

Кампаніі FinExpertiza падлічыла сярэдні тэрмін жыцця расіян на пенсіі. Паводле вынікаў даследавання, у Расіі мужчына пасля выхаду на пенсію пражыве ў сярэднім яшчэ 7,5 года, а жанчына — 22,6 года, гэта значыць амаль утрая даўжэй. Рэкордна доўгія тэрміны жыцця пасля надыходу пенсійнага ўзросту для мужчын і для жанчын зафіксаваны ў Рэспубліцы Інгушэція — 18,6 года і 29,1 года адпаведна. Меншы за ўсё так званы ўзрост дажыцця аказаўся ў Тыве, таксама і ў мужчын, і ў жанчын, — 1,3 і 16,2 года адпаведна.

iPhone — найважнейшы гаджэт дзесяцігоддзя

Выданне The Verge склала спіс са ста галоўных, на думку рэдакцыі, высокатэхналагічных прылад апошніх дзесяці гадоў. Найважнейшым гаджэтам дзесяцігоддзя названы iPhone 4. Паводле слоў галоўнага рэдактара медыя Ніла Патэла, апарат 2010 года выпуску з'яўляўся самым прыгожым, інавацыйным і ўплывовым смартфонам на рынку. На другім месцы апынулася смарт-калонка Amazon Echo, якая з'яўляецца адным з лідараў амерыканскага рынку разумных дэвайсаў, на трэці радок трапіў партатыўны ноўтбук MacBook Air. У рэйтынг таксама трапілі такія спрэчныя прылады, як электронная цыгарэта Juul, зношаныя кабелі для зарадкі iPhone, сэлфі-палка і спінер. Замыкаюць топ-100 акуляры Google Glass, якія былі выпушчаныя ў 2013 годзе, але так і не сталі папулярнымі.

Найлепшы прадукт для печані «пасля ўчарашняга»

Кітайскія навукоўцы высветлілі, якія бактэрыі здольныя аднавіць печань пасля ўжывання алкаголю. Даследчыкі Цзіліньскага сельскагаспадарчага ўніверсітэта правялі шэраг эксперыментаў і ўстанавілі, што лактабактэрыі могуць дабратворна ўплываць на гэты важны орган. З вядомых нам прадуктаў больш за ўсё лактабактэрый знаходзіцца ў звычайным кефіры, такім чынам, гэты прадукт здольны лепш за ўсё аздаравіць пацярпелую ад алкаголю печань.

Украла больш за 19 тысяч

Сышчыкі крымінальнага вышуку Першамайскага РУУС сталіцы затрымалі дзяўчыну, якая ўкрала ў грамадзяніна Рэспублікі Узбекістан больш за 19 000 рублёў.

Аператыўнікамі было ўстаноўлена, што напярэдадні мужчына пазнаёміўся з маладой асобай у забаўляльнай установе і запрасіў яе да сябе дадому. Раніцай, калі прачнуўся, выявіў прапажу 190 беларускіх рублёў, 3000 расійскіх рублёў і 20 долараў. Для таго, каб урэгуляваць канфлікт самастойна, мужчына патэлефанаваў новай знаёмай з просьбай вярнуць грошы. Дзяўчына паабяцала ўсё вярнуць. Так яна зноў трапіла ў госці да замежніка, які на наступны дзень не далічыўся ўжо 19 000 беларускіх рублёў. Пасля гэтага гаспадар звярнуўся па дапамогу ў міліцыю. Дзяўчына была затрымана ў арандаванай кватэры ў Гомелі. Выкрадзеных грошай пры сабе ў яе не было. Мінчанка растлумачыла аператыўнікам, што частку выкрадзеных грашовых сродкаў яна пераклала на картку сваякам, частку выдаткавала на адзенне і таксі са сталіцы ў абласны цэнтр.

Вядома, што 21-гадовая мінчанка працуе прадаўцом і раней да крымінальнай адказнасці не прыцягвалася, паведамляе падрабязнасці крымінальнай гісторыі ГУУС Мінгарвыканкама.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прыродныя рэсурсы

ЦЯПЛО НА ЭКСПАРТ

Будаўнічая пляцоўка пялетнага завода.

Новыя пялетныя заводы дазволяць пашырыць экспартны патэнцыял дрэваапрацоўчай галіны і больш рацыянальна выкарыстоўваць лесасыравінныя рэсурсы. Адно з такіх прадпрыемстваў будуецца ў вёсцы Слабудка Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.

— У мэтах выканання даручэння Прэзідэнта — павышэння эфектыўнасці выкарыстання лесасыравінных рэсурсаў — Міністэрствам лясной гаспадаркі вядзецца будаўніцтва шасці заводаў па вытворчасці пялет, — расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Мінлясгаса Уладзімір ШУТ.** — Яны пачнуць працаваць у першым паўгоддзі 2020 года на тэрыторыі Барысаўскага і Мазырскага вопытных, Пружанскага, Навагрудскага, Клічаўскага, Жыткавіцкага лясгасаў. Агульная гадавая магутнасць заводаў складзе каля 156 тысяч тон, у рэгіёнах будзе створана да 80 рабочых месцаў.

У міністэрстве чакаюць, што з выхадам на праектную магутнасць гэтыя заводы будуць перапрацоўваць каля 350 тысяч кубаметраў незапатрабаванай нізкаякаснай драўніны і 120—130 тысяч тон адходаў лесапілавання.

Што ж датычыцца завода ў вёсцы Слабудка, то, па словах **дырэктара Пружанскага лясгаса Уладзіміра ЖАЎНЕРЧЫКА,** прадпрыемства з дапамогай лініі літоўскай кампаніі Agregatas будзе вырабляць каля 20 тысяч тон пялет у год. З уводам у эксплуатацыю пялетнага завода разам з устаноўкай сушыльнага комплексу і ўжо дзеючай лініяй па дрэваапрацоўцы тут будзе створаны цэлы дрэваапрацоўчы комплекс.

Чаму сёння такая ўвага ўдзяляецца гэтай галіне? За апошнія дзесяць гадоў у краіне падвоіліся аб'ёмы лесанарыхтовак. І калі высакаякасная драўніна актыўна перапрацоўваецца, то нізкаякасная, якая таксама ўтвараецца пры лесанарыхтоўках, не заўсёды знаходзіць свайго спажыўца. Вытворчасць жа паліўных гранул з такой драўніны, а таксама з выкарыстаннем шчэпак і апілак, што ўтвараюцца пры вырабе піламатэрыялаў, дапаможа эфектыўней выкарыстоўваць патэнцыял лясных рэсурсаў.

Сёння нізкаякасная драўніна ў асноўным перапрацоўваецца ў



Пілавінне і трэскі, якія ўтвараюцца пры дрэваапрацоўцы, стануць сыравінай для вытворчасці пялет.

Вытворчасць пялетнага завода, які будуецца ў Пружанскім раёне, складзе 20 тысяч тон пялет у год.

трэскі, якія выкарыстоўваюцца для атрымання цеплавой энергіі на мясцовых міні-ТЭЦ, у сістэме ЖКГ і прадаюцца за мяжу. Дзейнічаюць у Беларусі і пялетныя вытворчасці, якія таксама працуюць з замежнымі партнёрамі. Але новыя заводы будуць больш магутныя: і па аб'ёмах інвестыцый, і па колькасці сыравіны, якую маюць перапрацоўваць.

Як адзначаюць спецыялісты, пялеты карыстаюцца попытам за мяжой, таму плануецца, што 99 % прадукцыі новых заводаў будзе адпраўляцца на экспарт. Па словах Уладзіміра Шута, з выхадам на праектную магутнасць лесагаспадарчыя ўстановы атрымаюць каля 18 мільёнаў долараў валютнай выручкі штогод. Сёння прапрацоўваюцца пытанні паставак у Літву, Латвію, Швецыю, Германію, Аўстрыю, Італію.

Як адзначыў **галоўны інжынер Брэсцкага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Віктар БРЫЛЬКОЎ,** паколькі падобны завод — першы ў краіне, у працэсе праектавання, праходжання тэхнічных, экалагічных экспертыз узнікалі розныя складанасці. Але спецыялісты упэўнены: вопыт, атрыманы падчас рэалізацыі праекта ў Пружанскім раёне, дапаможа зрабіць хутчэйшым і лягчэйшым будаўніцтва астатніх заводаў.

Вераніка КОЛАСАВА, фота аўтара і Мінлясгаса.

У жніўні Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка па выніках паездкі ў Старадарожскі раён даручыў распрацаваць праграму па забеспячэнні поўнай перапрацоўкі драўняных рэсурсаў. Размова ішла аб уцягванні ў абарот нізкаякаснай драўніны, прыдатнай для вытворчасці трэсак і паліўных пялет.

У канцы мінулага года было прынята рашэнне аб будаўніцтве шасці пялетных заводаў у краіне, а да канца 2021-га сіламі Мінлясгаса будзе пабудавана 12 пялетных заводаў. Будаўніцтва вядзецца за кошт асабістых сродкаў лясгасаў і крэдытаў. Распрацавана і Міжгаліновая праграма развіцця пялетных вытворчасцяў у Рэспубліцы Беларусь.

БЕЗ ЗНАЧНЫХ УЗРУШЭННЯЎ

Плюс 5 % — па выніках года

Другая палова снежня істотных змен на рынку Мінска не зробіць. Таму, што павышаная актыўнасць пакупнікоў пачала слабець. Вось у лістападзе быў залаты час для прадаўцоў, за гэты месяц аформлена 1,5 тысячы здзелак куплі-продажу. А ў снежні і тысячы не будзе. Самы час падводзіць вынікі.

Мікалай Прасталупаў падлічыў, што за год цэны на кватэры на другасным рынку ў сярэднім павысіліся на ўзровень інфляцыі, або на 5 %. Палічыце самі, калі ў пачатку года сярэдняя цана квадратнага метра была 1320 долараў, а цяпер мы маем 1390. Цэннік змяніўся не нашмат, але ўсё ж. Цэны на першасным рынку жылля таксама трохі падняліся. Тут квадратны метр быў у раёне 1250 долараў, цяпер мы маем павелічэнне да 1300 долараў, або ў сярэднім на 3 %.

Чаму «квадрат» працягваў даражэць? Якія фактары тут адыгралі галоўную ролю? Наш эксперт упэўнены ў тым, што асноўная прычына ўзняцця цаны заключаецца ў зніжэнні аб'ёмаў будаўніцтва. Другі фактар, які не дае ўзляцець цэнам сапраўды высока, — абмежаванне росту даходаў. Так атрымалася, што рэальныя даходы насельніцтва (у сярэдняга класа, які і купляе жыллё) актыўна не растуць, а ў некаторых выпадках нават знікаюцца. Гэта так, але асноўным з'яўляецца ўсё ж першы фактар.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акрамя таго, заўсёды другасны рынак нерухомасці «азіраўся» на суадносіны цэн на першасным рынку. Бо навошта купляць старое жыллё з гісторыяй, з не зусім удалай планіроўкай, калі можна пабудаваць новае і нават танней? А вось і не. Цэны на першасным рынку працягваюць расці. Чаму так?

У апошні год горад значна скарацію выдзяленне свабодных пляцовак пад будаўніцтва жылля. Пад камерцыйнае будаўніцтва жылля зямельныя ўчасткі выдзяляюцца праз аўкцыёны (што выліваецца для ўласнікаў у круглую суму), прадугледжана і аплата забудоўшчыкам нятанней інфраструктуры. Нічога не плацяць ні за зямлю, ні за інфраструктуру толькі арганізацыі, якія будуюць ільготнае жыллё (у большасці — для шматдзетных сем'яў).

Пачакаем да вясны

Што ж будзе ў наступным годзе? Як цэны будуць сябе паводзіць ужо ў студзені і лютым? Спецыялісты сферы нерухомасці не па чутках ведае, што першыя два месяцы новага года лічацца ў нас «мёртвым» сезонам. У гэты час актыўнасць пакупнікоў будзе мінімальная. Звычайна сур'ёзныя тэндэнцыі пачынаюць праяўляць сябе вясной і восенню.

Апошнім часам кіраўніцтва сталіцы прытрымліваецца думкі, што трэба да мінімуму скарациць жыллёвае будаўніцтва ў межах горада. Існуе меркаванне, што кватэры для шматлікіх чаргавікоў трэба ўзводзіць у гарадах-спадарожніках. Мікалай Прасталупаў у гэтым выпадку лічыць, што ў наступным годзе будзе ўзмоцнена скарачацца камерцыйнае будаўніцтва, за выключэннем будаўніцтва для шматдзетных сем'яў. Пад пільнай увагай будуць знаходзіцца нават участкі зямлі за кальцавой зонай, непасрэдна ў Мінскім раёне і нават далей. У сувязі з гэтым прагноз па цэнах на кватэры ад Прасталупава такі.

Будаваць жыллё для ўсіх ахвотных (камерцыйнае) будуць значна менш. Забудоўшчыкам стане сапраўды цяжка ўзводзіць даступнае жыллё і атрымліваць нават мінімальны прыбытак. Апошнім часам пайшлі размовы аб тым, што арганізатары камерцыйнага жылля павінны будуць кампенсаваць не толькі знос старых пабудоў на сваіх пляцоўках, але і фінансаваць будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў (дзіцячых садкоў, паліклінік і школ). А гэта будзе значным фактарам для падаражэння як новабудоўляў, так і другаснага жылля.

Канчатковы гадавы прагноз па кошце квадратнага метра ад нашага спецыяліста — плюс 4,5-5 % па кватэрах на другасным рынку жылля. Будзе даражэць жыллё і ў новабудоўлях, калі кватэры без адстройвання прыплюсуюць да сённяшняй цаны дзесьці 3-4 % за год.

Тэндэнцыі тыя ж і ў рэгіёнах

Як будзе паводзіць сябе рынак нерухомасці ў сярэдніх і маленькіх гарадах, цяпер спрагназаваць досыць складана. Гэта залежыць ад многіх фактараў.

Зніжэнне аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва зараз характэрна для многіх буйных гарадоў, за выключэннем, мабыць, Гродна. У гэтым абласным цэнтры ўзводзяцца цэлыя новыя мікрараёны сапраўды па даступных цэнах, лічыць наш эксперт. Астатнія абласныя цэнтры тэндэнцыя на падаражэнне закране з невялікім спазненнем. Так было заўсёды, сённяшняя сітуацыя не выключэнне.

Невялікае падаражэнне ў абласных цэнтрах назіраецца ўжо цяпер. Па сканчэнні мінулага тыдня там склалася наступная цэнавая сітуацыя: Брэст — 809 долараў за квадратны метр (+0,4 % за тыдзень), Віцебск — 616 долараў (без змен за тыдзень), Гомель — 619 долараў (+0,2 %), Гродна — 732 долараў (-0,4 %), Магілёў — 631 долар (+0,5 %).

Якія стаўкі падатку на зямлю і нерухомасць устанаўліваюць на 2020 год

У Брэсцкім раёне, напрыклад, для фізічных асоб стаўкі зямельнага падатку на 2020 год павысілі ў 2 разы, а на нерухомасць — у 1,5 раза (для тых, хто запісаны ў садаводчых таварыствах, а таксама для ўладальнікаў гаражоў індывідуальнай забудовы, — у 2 разы), у Крупскім раёне — у 1,5 і 1,3 раза адпаведна, у Лідскім — у 1,8 і 1,5 раза адпаведна.

У Клецкім раёне стаўкі зямельнага падатку і падатку на нерухомасць для насельніцтва ў 2020 годзе павысяць у 1,5 раза, у Пінскім (акрамя гарадскога пасёлка Лагішын), Асіповіцкім, Слаўгарадскім, Чавускім — у 2 разы, у Касцюковіцкім — у 1,1 раза. Стаўку зямельнага падатку ў Зэльвенскім раёне ў наступным годзе павялічаць у 1,7 раза, у Беластавіцкім — у 2 разы.

Падаткавікі тлумачаць, што зніжэнне каэфіцыентаў адаб'ецца і на сумах падаткаў, якія будуць выстаўлены да выплаты. Гэта значыць сума будзе ніжэйшай. Падатак на нерухомасць у сярэднім па краіне за 2018 год склаў 40 рублёў на аднаго плацельшчыка, у Мінску — 65 рублёў. Памеры зямельнага падатку ў сярэднім па краіне — 18 рублёў, у Мінску — 116 рублёў. Зямельны падатак разлічваецца з кадастравага кошту зямлі, а ў сталіцы ён высокі.

Сяргей КУРКАЧ.

❍ Дарэчы

МАЁМАСНЫЯ ПАДАТКІ ЗМЯНЯЮЦЦА

У нашай краіне ўстанаўліваюць стаўкі падатку на нерухомасць і зямлю на 2020 год. Мясцовыя ўлады могуць памяншаць або павялічваць дзеючыя стаўкі, але не больш устаноўленага. Нагадаем, што падатак на нерухомасць налічваюць ад кошту аб'екта нерухомасці.

Стаўка падатку на нерухомасць для грамадзян, у якіх ёсць ва ўласнасці капітальныя будынкі, а таксама машына-месцы, складае 0,1 % ад кошту аб'екта нерухомасці. А для тых, хто валодае двума і больш жылымі памяшканнямі ў шматкватэрных ці блакіраваных жылых дамах, — 0,2 % ад кошту такіх памяшканняў.

Стаўкі зямельнага падатку могуць павялічвацца або памяншацца мясцовымі Саветамі дэпутатаў для асобных катэгорый плацельшчыкаў. Нагадаем, са студзеня гэтага года ў Беларусі запрацаваў абноўлены Падатковы кодэкс. Некаторыя змены закранулі падатак на нерухомасць і зямлю. Для мясцовых уладаў — Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, а таксама для іх калег з абласцей — устаналівалі ліміты па стаўках падатку на нерухомасць і зямлю. На 2019 год яго максімальны памер маглі павышаць у 2,5 раза, а з 2020-га — не больш чым у 2 разы.

Сямейная газета

Выпуск № 18 (136)

КАБ ВЕРЫЛІ

«Калі я была маленькая, хадзіла ў гэты садок, а цяпер хачу ў школу!» — звонка, на ўсю вуліцу, распавядае мая малодшая. І мінакі міжволі ўсміхаюцца, бо гэтай «ужо амаль дарослай» чатыры гады ад нараджэння, і да школы ёй амаль палова жыцця.

Дзяцей — маленькіх, не вельмі і нават даўно ўжо не маленькіх — заўжды цікава распытваць пра мінулае і кожны раз здзіўляцца, як па-рознаму бачацца адны і тыя ж рэчы. «Калі я была маленькая, ніхто нас так не захутваў з ног да галавы, каб толькі не чхнулі — што было, тое і насілі. Адзін хлопчык, памятаю, так хацеў коўзацца на горцы, што басанож з дому выбег, пару разоў пракаціўся і бегма дадому, пакуль мамка не ўбачыла і не насварылася», — дзеліцца, бадай, найстарэйшая супрацоўніца рэдакцыі, дзяцінства якой выпала на суровыя пасляваенныя гады. «Калі я быў зусім маленькі, катаўся, як усе, на звычайных санках, а потым тата мне спецыяльны дзіцячы снегаход купіў, так было крута!» — гэта ўжо суседскія хлопчыкі гадоў 10—12 абмяркоўваюць.

«Адзін з самых яркіх успамінаў дзяцінства — як шалёна я хацеў з дзедам і дарослымі мужыкамі паехаць на сенакос. А бабка паставіла ультыматум — нацягнуць на мяне калготкі. Каб не замерз раніцой. Я закаціў скандал, але не пагадзіўся. Тады, зразумела, дарослыя мяне нікуды не пусцілі, і я пакрыўдзіўся так моцна, што ўсё лета свавольнічаў, як толькі мог», — згадвае муж. А ў яго аднагодка, толькі выключна гарадскога, успаміны зусім іншыя: «У сваякоў на вёсцы мы былі рэдка, але затое кожныя «госці» станавіліся вялікім святам, і бабуля пякла такія смачныя аладкі, што яе ўжо больш трыццаці гадоў, як няма, а смак і рукі, якія нясуць смятану, дагэтуль помню...»

«Калі я была маленькая, мы не святкавалі Новы год, у мяне ў галаве зусім не адклалася падрыхтоўка да яго, хіба школьная ёлка, — расказвае калега. — Галоўным святам у нас былі Каляды, з падарункамі ўсім родным, са спецыяльнымі пачастункамі, з паходам у царкву. Цяпер стараюся ўжо сваім дзецям падарыць гэта казачнае адчуванне, але не ведаю, ці атрымліваецца, бо ў нас быў дэфіцыт, а ў іх — празмернасць усяго, ласункаў, цацак, упрыгожанняў...» «Я, калі быў маленькі, моцна пасварыўся з братам, бо прапала прывезеная татам з Германіі металічная машынка, і я вырашыў, што гэта ён узяў і з зайздрасці схаваў. А праз добрыя дзесяць гадоў прапажа знайшлася, калі разбіралі «на выкід» вялізную, яшчэ дзедаву, дубовую шафу — там ззаду нейкая фанерка адышла, і машынка правалілася ў адтуліну. Уяўляеш, як ідыёт, я крыўдаваў на брата, а схаваў, хутчэй за ўсё, сам! Мы рагаталі, як дурні. Падарыў машынку ягонаму сыну», — падзяліўся ўспамінамі знаёмы фатограф.

Такіх пазлаў-успамінаў насамрэч вельмі шмат. І ведаеце, што, на мой погляд, іх аб'ядноўвае? Шчырасць і памеры перажытых пачуццяў. Калі радасць, то ўсёпаглынальная, калі крыўда, то на цэлы белы свет, калі вера, то непарушная. Дзеці, пакуль яшчэ маленькія, наогул вераць блізкім, як нікому: што калі доўга не класціся спаць, то прыйдзе шэранькі ваўчок, што зубная фея мяняе малочныя зубкі на манеткі, што падарункі пад ёлку кладуць не мама з татам, а сапраўдны Дзед Мароз, які атрымаў ліст, пакладзены ў лядоўню... А ўжо мы, дарослыя, ведаем, колькі для цуда трэба прыкласці намаганняў, сіл і часу. Але хіба гэта нагода, каб, ідучы запаветамі Надзеі Крупскай, пазбаўляць дзяцей казкі, якая «ўводзіць ад рэальнага жыцця»? Паверце, крытыкаў, скептыкаў і выкрывальнікаў на іх жыццёвым шляху будзе значна больш, чым чараўнікоў. Таму не спяшайцеся раней часу разбіваць веру, чаканні і надзеі на цуды. Тым больш, яны сапраўды часам здараюцца — і калі вельмі пастарацца, і нават калі гэтага не чакаеш. У далёкім 1942 годзе Аляксандр Грын уклаў у вусны свайго героя простую мудрасць: «Ёсць не меншыя цуды, чым зробленыя сваімі рукамі. Усмешка, весялосць, дараванне, і — у час сказанае, патрэбнае слова. Валодаць гэтым — значыць, валодаць усім». Ну як, хочаце пабыць крыху чараўнікамі?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Пераадоленне

«Я аптыміст па натуры»

Былы дырэктар школы расказаў, як спраўляецца з выпрабаваннямі і захоўвае аптымізм

Аляксандру КСЯНЕВІЧУ 65. Жыве ў горадзе Жодзіна з жонкай Нэлі. Мае чатырох дарослых дачок, у тым ліку трайнят. Раней працаваў дырэктарам школы. Цяпер на пенсіі. 13 гадоў таму жыццё мужчыны кардынальна змянілася. Як гром сярод яснага неба прагучаў дыягназ — хвароба Паркінсона. Доўгі час Аляксандр Казіміравіч не расказваў публічна пра гэта, саромеўся, не хацеў, каб яго шкадавалі. А нядаўна пагадзіўся на шчырую размову. У першую чаргу, каб падняць дух людзям з падобнымі цяжкімі захворваннямі: на ўласным прыкладзе паказаць, што медыцынскі дыягназ можа адкрыць не толькі шлях бездапаможнасці, але і шлях творчасці.

Ідэю вырабляць шахматныя столікі падказала Аляксандру Казіміравічу жонка падчас чарговай сумеснай партыі.

— Аляксандр Казіміравіч, памятаеце момант, калі даведаліся пра сваю хваробу? Хто западозрыў няладнае?

Мне было 52 гады, калі жонка пачала заўважаць, што я стаў неяк павольна рухацца. Хоць мне самому так не здавалася. Быў упэўнены, што рухаюся як звычайна, а яна прыдумляе тое, чаго няма... Так працягвалася пару месяцаў, пакуль, аднойчы, вяртаючыся дадому пасля святкавання юбілею сваёй школы, не адчуў вялізную стомленасць. Я ледзь перастаўляў ногі. Гэта не было звязана з алкаголем. Гэта было нешта новае, незнаёмае. Мае ногі як быццам наліліся свінцом. Я не адчуў трывогі і спісаў усё на натуральную стомленасць, звязаную з падрыхтоўкай да юбілейных мерапрыемстваў. Аднак з гэтага моманту выпадкі праяўлення «непаслухмяных» ног сталі рэгулярныя. І тады ў падсвядомасці неяк само сабой усплыло дзесьці выпадкова пачутае слова — Паркінсон. Я ўспомніў, што пра хваробу рухальнага тармажэння чуў у сувязі з лёсам знакамітага баксёра Махамеда Алі. Паглядзеў у інтэрнэце інфармацыю аб гэтым захворванні і зразумеў, што прыкметы сыходзяцца. Доктар пацвердзіў дыягназ.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

Давайце абмяркуем

ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ, МАЦНЕЙ!..

Ці лёгка вырасціць чэмпіёна?

Напэўна, усе, хто хоць раз наведваў дзіцячую спартыўную секцыю, назіралі карціну, як дзіця перад заняткамі са слязьмі не можа адарвацца ад свайго бацькі. Ці як трэнер, не здольны дамагчыся патрэбнага выніку, гарлапаніць на сваіх выхаванцаў. А можа быць, як малады спартсмен, атрымаўшы недарэчную траўму, не рашаецца зноў падысці да снарада і паспрабаваць зрабіць сарваны элемент... Потым, вырастаючы, спартсмены аналізуюць свае няўдачы і кажуць, што правалы часта абумоўлены не фізічнай негатоўнасцю, а псіхалагічнымі праблемамі або хваляваннем. А поспех у вялікім спорце на 50 працэнтаў складаецца менавіта з псіхалогіі. Таму сёння ў кожнай зборнай ёсць не толькі спартыўны доктар, але і псіхолаг, які штодня працуе з атлетамі. А вось ці патрэбны ён дзецям, як правільна вызначыць від спорту, які падыходзіць для вашага дзіцяці, ці варта ўвогуле прымушаць яго хадзіць на трэніроўкі і як дапамагчы вырасці чэмпіёну, расказала спартыўны псіхолаг з пятнаццацігадовым стажам Кацярына БУЧА.

— Кацярына, сёння большасць бацькоў, прыводзячы дзіця ў спартыўную секцыю, хочуць абавязкова вырасціць чэмпіёна, забываючы аб жаданні самога дзіцяці. Ці правільна гэта?

— У гэтым выпадку спачатку бацькам трэба разабрацца са сваімі амбіцыямі, зразумець, што стаіць за іх жаданнем. Часта бацькі адпраўляюць дзіця «стаць чэмпіёнам», таму што самі такімі не сталі. Гэта іх боль, спачатку трэба разабрацца з ім, каб не траўмаваць малое. Трэнеры і бацькі нават прымяняюць фізічнае насілле, каб «выціснуць» з дзяцей гэта чэмпіёнства...

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Сацыяльная кансультацыя

Два пытанні пра зарплату

На іх адказваюць спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.

? Ці абавязаны наймальнік выплаціць зарплату адначасова з выплатай сярэдняга заробку за час працоўнага водпуску? (Мартынава Я. П., г. Мінск)

— Заработная плата выплачваецца ў дні, вызначаныя ў калектыўным дагаворы, пагадненні або працоўным дагаворы (артыкул 73 Працоўнага кодэкса), гэта значыць, такія дні фіксаваныя. Перанос тэрмінаў выплаты заработнай платы адбываецца ў абавязковым парадку толькі ў выпадках іх супадзення з выхаднымі днямі або дзяржаўнымі святамі і святочнымі днямі, якія абвешчаныя нерабочымі.

Сярэдні заробак за час працоўнага водпуску выплачваецца не пазней чым за два дні да пачатку адпачынку (арт. 176 Працоўнага кодэкса), а для асоб, якія працуюць па кантракце, — не пазней чым за адзін дзень (п. 4 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.07.1999 № 29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны»). Адпаведна, дзень выплаты сярэдняга заробку вызначаецца часам прадастаўлення працоўнага водпуску.

Такім чынам, тэрміны выплаты зарплаты і сярэдняга заробку за час працоўнага водпуску могуць не супадаць. Абавязак пераносіць тэрмін выплаты зарплаты, калі ён не супадае з днём выплаты сярэдняга заробку за час адпачынку, заканадаўствам не ўстаноўлены.

* * *

? Раскажыце пра парадак аплаты работы ў начны час. (Віктар Паўленка, г. Брэст)

Згодна з артыкулам 70 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, за кожную гадзіну работы ў начны час або ў начную змену пры зменным рэжыме працы ажыццяўляюцца даплаты ў памеры, які ўстанаўліваецца калектыўным дагаворам, пагадненнем, наймальнікам, але не ніжэй за 20 працэнтаў гадзіннай тарыфнай стаўкі (акладу) работніка.

Так, наймальнік абавязаны аплаціць у павышаным памеры начны час (з 22 гадзін да 6 гадзін) або ўсе гадзіны начной змены. Пры гэтым начной зменай лічыцца змена, у якой больш за 50 працэнтаў рабочага часу прыпадае на начны час.

Даплата за кожную гадзіну работы ў начную змену можа праводзіцца толькі пры выкананні наступных умоў:

работніку ўстаноўлены зменны рэжым працы;

працягласць рабочай змены не перавышае 12 гадзін;

больш за 50 працэнтаў рабочага часу ў змену прыпадае на начны час (з 22 гадзін да 6 гадзін).

Калі змена не з'яўляецца начной, то даплаты адбываюцца толькі за кожную гадзіну работы ў начны час (з 22 гадзін да 6 гадзін).

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ, МАЦНЕЙ!..

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Вельмі разумны падыход практыкуюць у Германіі — на пачатковым этапе ў іх няма дзялення па відах спорту. Да 6 гадоў дзеці проста развіваюць агульныя якасці — каардынацыю, спрыт, хуткасць. Потым ужо ім паказваюць розныя віды спорту з поўным пагружэннем на паўгода. Напрыклад, паўгода яны займаюцца плаваннем, паўгода — баскетболам. Тады дзіця разумее, што яму цікава, а цела і псіхіка ўжо гатовыя да любога віду спорту.

— Калі дзіця не хоча займацца спортам, яго варта прымушаць?

— Трэба разбірацца, чаму не хоча. Магчыма, яму складана расставацца з бацькамі. Літаральна нядаўна назірала, як шасцігодак прывялі на заняткі па хакеі, у аднаго з дзяцей падвышаная трывожнасць, ён не хоча адыходзіць ад таты. А тату сорамна, што ў яго такое дзіця, і ён яго адштурхоўвае, гоніць на трэніроўку. На самай справе, сыну трэба было адваротнае: каб яго абнялі, паказалі, што ён у бяспецы, што бацька побач, і тады ён спакойна пойдзе і будзе займацца. Зноў жа, такая трывожнасць дзіцяці з'явілася нездарма, значыць, бацькі рабілі штосьці не так. Трэба памятаць, у дзяцей праблем няма, праблемы ў дарослых, і калі дзіця сябе дрэнна паводзіць, мы глядзім у першую чаргу на бацькоў.

«Бацькам і дзецям трэба разумець: калі спартсмен пераходзіць у дарослую каманду, яму працаваць трэба так, быццам ён нічога не ўмее».

Важна ўлічваць, чаго хоча само дзіця. У мяне быў выпадак, калі бацькі аддалі малога ў тэніс, маўляў, гэта прэстыжна, адпавядае іх узроўню — а ён футболам хоча займацца. Тэніс — індывідуальны від спорту, значыць, падыходзіць інтравертам, а калі хлопчык хоча займацца футболам, то ён, хутчэй за ўсё, экстраверт, гэта значыць, вельмі таварыскі, зусім іншы склад тэмпераменту.

Таксама часта сустракаюцца выпадкі, калі дзеці з аднаго віду спорту пераходзяць у другі, трэці, бацькі пачынаюць абурацца, а на самай справе для дзяцей гэта нармальна, яны шукаюць. Калі дзіця знойдзе тое, што яму падабаецца, то яго не прыйдзецца цягнуць на трэніроўку. А калі ўсё ж даводзіцца цягнуць, то трэба разбірацца, што не так. Можа, трэнер яго абражае? У мяне цяпер адразу некалькі дзяцей адмовіліся займацца спортам, таму што больш не вытрымліваюць абразы і ціск з боку трэнера.

— У нас ёсць праблема з псіхалагічнай падрыхтоўкай дзіцячых трэнераў?

— Яны, безумоўна, павінны яе праходзіць, але не вельмі хочуць. Ва ўніверсітэце фізкультуры выкладаюць спартыўную псіхалогію, і таму многія лічаць, што яны ўсё ведаюць. Я 15 гадоў у гэтай сферы і шмат чаго не ведаю, вучуся да гэтага часу, у тых жа дзяцей. Калі тлумачу, чаму трэнеры крычаць на іх, па-першае, кажу, пра страх. Трэнеру страшна, таму што з яго таксама патрабуюць вынік. Вынік — гэта яго заробак, заробак — гэта абавязак пракарміць сям'ю і гэтак далей. Трэнер павышае голас, бо не ведае, як па-іншаму. А да кожнага дзіцяці трэба шукаць індывідуальны падыход.

— У якім узросце дзіця эмацыянальна гатова да сур'ёзных заняткаў спортам?

— Па-рознаму. Я перастала прывязвацца да ўзросту. Да мяне неяк прыйшоў сямігадовы хлопчык і расказаў, што цалкам разлічыў, колькі ён будзе трэніравацца, колькі яму на гэта трэба часу, якія нарматывы неабходна выканаць і нават які ў яго будзе заробак. А ёсць дзеці, якія ў 10 гадоў проста гуляюць з усім, і пераконваць іх у тым, што яны павінны быць дарослымі, бессэнсоўна.

— Спорт значна памаладзеў, у многіх відах з дзяцей гадоў да 15 выціскаецца іх максімум, а потым яны аказваюцца непатрэбнымі, не могуць знайсці сябе ў жыцці...

— Спартсменам, якія да мяне прыходзяць, я заўсёды задаю пытанне: «Што потым? Якая ў цябе канчатковая мэта, куды ты ідзеш у сваім спорце і куды ў жыцці?» Раблю гэта для таго, каб яны разумелі, чым будуць займацца пасля. Тады не будзе адчування, што іх кінулі. У нас вельмі баяцца казаць пра траўмы, якія могуць спыніць кар'еру ў любым узросце, а гэта няправільна, да такой будучыні трэба быць гатовым. Часта былыя спартсмены знікаюць, співаюцца, ідуць працаваць трэнерамі і ненавідзяць сваю работу, таму што ў спорце яны былі зоркамі, якім плацілі вялікую зарплату, а тут яны — работнікі з малым заробкам. Адсюль з'яўляецца агрэсія ды іншы негатыў. Я б казала пра тое, што будзе пасля сыходу са спартыўнай арбіты, ужо з дзяцінства. Трэба, каб у дзіцяці было нейкае цікавае хобі, акрамя спорту. Чаму яўрэяў вучылі іграць на скрыпцы? Каб, калі наступяць галодныя часы, ты выйшаў, адыграў і на ежу сабе зарабіў. Выдатна, калі ёсць «запасная» прафесія, якая цябе пракорміць. Да таго ж, дзіцяці трэба вучыць правільна распараджацца грашыма.

— На жаль, часам дзеці сутыкаюцца з траўмамі, з'яўляецца страх выконваць тое ці іншае практыкаванне, выходзіць на гульню.

— З гэтай праблемай да мяне звяртаюцца вельмі часта. Са страхам важна разабрацца і дастаць да самага дна, зразумець, чаго канкрэтна баіцца спартсмен. У нас не прынята баяцца, лічыцца, што гэта сорамна. На самай справе, у страху ёсць функцыя — паведаміць аб парушэнні бяспекі, таму, калі страшна, трэба глядзець, дзе парушаецца бяспека. Для спартсмена парушэнне бяспекі — гэта няправільнае выкананне дзеяння. Траўма адбываецца з-за таго, што здзейснены няправільныя тэхнічныя дзеянні, парушана механіка рухаў. Работа над страхам — гэта няпросты алгарытм, мозгу трэба зразумець, што і як ты робіш. Чым больш дэталёва чалавек у ім разбярэцца, тым менш будзе баяцца. Мозг дакладна ведае, дзе спартсмен можа памыліцца, проста трэба дазволіць яму ўбачыць гэтую карціну. Таму спачатку я прашу спартсмена прамаляваць у галаве поўную карціну таго, як ён выконвае практыкаванне, у які момант памыляецца, як падае і што робіць пасля падзення. Каб мозг супакоіўся, яму трэба «паказаць», што калі нейкая падзея адбудзецца, ён будзе ведаць, што рабіць. Другі крок — прадумаць, што трэба зрабіць, каб пазбегнуць траўмы. Тут ужо мы глядзім тэхніку, усё распісваецца па алгарытмах і пракручваецца ў галаве з візуалізацыяй. Далей ідзе адпрацоўка на ўзроўні рэфлексаў, бо калі спартсмен на гэтым узроўні не можа зрабіць рух, то на спаборніцтвах яго не выканае. Дакладней, выканае, але верагоднасць памыліцца вельмі высокая, таму што на спаборніцтвах вельмі высокі ўзровень стрэсу. Часта спартсмены кажуць, што на трэніроўцы ўсё атрымліваецца, а на спаборніцтвах не. Усё проста — на трэніроўцы мозг недастаткова загружаны, а вось на спаборніцтвах ён заняты дадатковай працай, спартсмен пастаянна думае, што на яго глядзяць, што на яго спадзяваюцца, а ці зможа ён выканаць усё беспамылкова, і гэтак далей. Такім чынам, калі на трэніроўцы выкананню задання спартсмен аддае каля 80 працэнтаў увагі, то на спаборніцтвах, у лепшым выпадку, іх застаецца 40.

Звычайна праблема заключаецца ў тым, што мы не ўмеем кіраваць сваім мозгам. Зразумела, кіраваць ім вельмі складана, але дамовіцца, навучыцца адчуваць — магчыма. Таму я са спартсменамі працую над усведамленнем дзеянняў, вучу свядома выконваць рухі, гэта значыць, адчуваць рух, як смак ежы. Калі чалавек можа кіраваць і кантраляваць рух, страху няма. Каб выправіць рух, кажуць, патрэбны тысячы паўтораў, а праз усвядомленасць можна зрабіць гэта за 15 хвілін.

— Яшчэ адна праблема — пераход з дзіцячага спорту ў дарослы. На ваш погляд, яна сапраўды існуе?

— Так, таму што патрабаванні змяняюцца. Дапусцім, у падлеткавым узросце чалавек паспяховы ў сваім відзе, ён пераходзіць у дарослую каманду і становіцца ўжо не зоркай, а звычайным спартсменам, як мноства іншых. Але ён прывык быць зоркай, а гэта значыць, ім усе захапляюцца, пры тым, што сам спартсмен не асабліва і напружваецца. А тут атрымліваецца — не захапляюцца. Няма захаплення — «зорка» пачынае чахнуць, псіхалагічна ламаецца. Бацькам і дзецям трэба разумець: калі спартсмен пераходзіць у дарослую каманду, яму працаваць трэба так, быццам ён нічога не ўмее. Дарэчы, у амерыканцаў такой праблемы няма. Там спартсмены па-іншаму ставяць мэты. У нас важна трапіць у зборную ці трапіць у Нацыянальную хакейную лігу, напрыклад. Я кажу такому чалавеку: можна паехаць у ЗША ці Канаду, купіць білет на матч і трапіць у НХЛ. Канчатковая мэта павінна быць іншай: не трапіць у зборную, а выйграць чэмпіянат свету, напрыклад. Я вучу спартсменаў ставіць мэты па сістэме SMART. Мэта павінна быць пэўная і канкрэтная, якую можна вымераць, дасягальная, рэлевантная і актуальная, гэта значыць, неабходная (гэта павінна быць сапраўды тое, чаго жадае чалавек), але абмежаваная па часе. Тэрміны абавязковыя. Мы прапісваем, якія спаборніцтвы, на якім этапе спартсмен павінен выйграць. Аналізуем, якімі якасцямі ён валодае, а якіх яму не хапае.

«Калі дзіця знойдзе тое, што яму падабаецца, то яго не прыйдзецца цягнуць на трэніроўку. А калі ўсё ж даводзіцца цягнуць, то трэба разбірацца, што не так».

— Часта кажуць пра «характар чэмпіёна». Ці сапраўды ёсць якасці, якія вызначаюць пераможцу?

— Ёсць, але вызначыць у дзяцінстве, хто «стрэліць», немагчыма. Ведаю, што цяпер папулярная тэма — даследаваць гены. Так, вы можаце вызначыць, што ў дзіцяці ідэальны набор генаў, але самае галоўнае — тое, чаго яно само хоча. У кожнага свае здольнасці. Аднаму ўсё даецца хутка, і ён не шануе гэтага, а іншаму даецца цяжка, але за кошт сваёй працы, характару і здольнасці выпаўзці «на зубах» ён пакажа вынік. Шмат што залежыць ад трэнера і ўмоў трэніровак. Вельмі многае сёння залежыць ад бацькоў, бо спорт памяняўся, цяпер у ім вельмі вялікая канкурэнцыя. Дзяцей шмат, трэнеры не ўсім могуць надаць аднолькавую ўвагу, і калі мэта — чэмпіёнства, не выключана, што давядзецца наймаць і дадатковых настаўнікаў. Калі такой мэты няма, задача бацькоў — проста падтрымліваць дзяцей, дапамагаць, натхняць.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

«ХАЧУ БЫЦЬ КАРЫСНАЙ ДЛЯ ІНШЫХ»

Ёсць у свеце два супрацьлеглыя рухі: пралайферы і чайлдфры. Пралайферы вядуць барацьбу за жыццё зачатых дзяцей, займаюцца асветніцтвам, расказваюць пра эмбрыянальнае развіццё дзіцяці, адкрываюць крызісныя цэнтры, дзе цяжарная жанчына можа часова пажыць. Чайлдфры, наадварот, змагаюцца з перанасяленнем планеты, лічаць, што адсутнасць дзяцей — прывілей развітога грамадства.

А ёсць людзі, якім хочацца, каб ва ўсіх былі роўныя магчымасці, незалежна ад поглядаў і перакананняў, і таму проста мяняюць сваё жыццё. Так здарылася з маладой шматдзетнай мамай Дар'яй КЛАСКОЎСКАЙ, у якой нарадзілася дачка з сіндромам Даўна.

Мама Дар'я з дачушкамі Вітай, Любашай і Верай.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

РАШЭННЕ

Даша нарадзіла раней за тэрмін з дапамогай кесаравага сячэння. Немаўля павезлі адразу ў РНПЦ «Маці і дзіця», бо яна з'явілася на свет з малой вагой, а маладая маці засталася ў радзільні, каб аднавіцца пасля аперацыі.

«Урачы мне нічога не гаварылі, — успамінае Дар'я. — Я хвалявалася і чакала таго моманту, калі змагу ўбачыць сваю малую».

Пасля выпіскі жанчына тут жа паехала ў Цэнтр да малой. Яна рыхтавала сябе да натуральнага кармлення, каб даць сваёй дачцэ самае лепшае. Але на наступны дзень ўсё змянілася...

«Як у вас з нервамі, матуля, гатовы ўспрымаць інфармацыю? — спытала ўрач у маладой мамы. — Мяркуем, у вашай дачкі сіндром Даўна. Рыхтуйцеся атрымаць падцвярджэнне».

Даша расла ў той час, калі сустрэць дзяцей з такім сіндромам проста на вуліцы было амаль немагчыма, таму яна нават не магла ўявіць, што гэта такое.

«Нават цяпер успамінаю той момант і нямею... Мне казалі жудасныя рэчы, накшталт таго, што, магчыма, малая не будзе хадзіць, не будзе размавіць, што я мама, — гаворыць Дар'я. — Шчыра, хацелася б узяць маю Любу і паказаць ім зараз...»

Першая думка, якая прыйшла ў галаву тады — адмовіцца ад дачкі. (Малая была першынцам дваццацігадовых сужэнцаў.) Урачы, убачыўшы стан маладой маці, папрасілі яе паехаць дадому і ўсё абдумаць. Даша паехала.

Малады бацька, даведаўшыся аб дыягназе, застаўся спакойны. Ён не выступаў ні заўзятым праціўнікам, ні заўзятым абаронцам дачкі. Гатовы быў прыняць любое рашэнне сваёй жонкі. Родныя маладой мамы не пасмелі ціснуць на яе. Ніхто б ніколі не асудзіў Дар'ю за рашэнне адмовіцца ад дачкі, ніхто не настойваў забіраць малую.

«Адказнасць за рашэнне ляжала толькі на мне. На той момант я была ў наймацнейшым стрэсе, здавалася, што не спраўлюся, што гэтае дзіця — крыж на маім жыцці. Проста вар'яцела ад тых думак, што раіліся ў маёй галаве. — Даша на хвіліну змаўкае. — Я не змагла яе кінуць. Вярнулася ў радзільню з рашэннем забраць Любашу дадому».

ПЕРАШКОДЫ І ПЕРААДОЛЕННІ

Дома Дар'я стала сама шукаць больш інфармацыі аб сіндроме. Вядома, урачы дапамагалі маладой маці: афармілі інваліднасць, кансультавалі па пытаннях, як расціць неданошаных дзяцей. Але Дар'і ніяк не ўдавалася зразумець, як выхоўваць такіх дзетак, на што звяртаць увагу. Калі малой было восем месяцаў, Даша сустрэла жанчыну, у якой сын быў з сіндромам Даўна, і тая параіла ёй добрага дэфектолага.

«Аказалася, знайсці добрага неабыякавага і ўважлівага спецыяліста вельмі складана,— гаворыць Даша. — З асаблівым дзіцем трэба займацца ўзмоцнена і кожны дзень. Я даведалася аб гэтым, калі стала хадзіць да добрага дэфектолага. Ну, напрыклад, я думала, што Люба будзе адставаць ва ўсім... Але аказалася, што ў сацыяльна-бытавым плане яна не павінна адставаць.

Нам трэба было з самага пачатку вучыць яе, як карыстацца лыжкай ці кубачкам, не павінна быць ніякіх патураннняў. Мне заўсёды спецыялісты паўтаралі: хочаш выхаваць інваліда — гадуй як «асаблівае» дзіця, а хочаш, каб малая жыла ў грамадстве, як звычайная, гадуй, як гадуюць звычайных дзяцей».

Асаблівасці, канешне, усё роўна заставаліся, і калі маленькай Любе ўдавалася іх пераадолець, усе родныя ўспрымалі гэта, як вялікую падзею.Так, Люба была не вельмі дужай дзяўчынкай, і таму ў яе не атрымлівалася хадзіць амаль да двух гадоў. Хадзіла ўздоўж апор, а калі адпускала ручкі, то адразу падала. І калі ўсё ж яна пайшла, гэта было свята. Больш спакойна да падобных дасягненняў сталі ставіцца толькі пасля нараджэння другога дзіцяці.

«Адважыцца на другое дзіця было вельмі цяжка, — расказвае Дар'я. — Але мы разумелі, што калі ў нашай сям'і народзіцца яшчэ адно малое, то гэта будзе на карысць нам усім: мы б менш зацыкліваліся на Любе, а ў яе з'явіцца сябар і добры штуршок для развіцця».

Хутка Любе трэба было ісці ў дзіцячы садок. Выбралі інтэграваную групу. Група здавалася гарманічнай, пакуль ўсе звычайныя дзеці не пайшлі ў школу. У садку засталіся толькі асаблівыя, новых малых набраць не ўдалося, так паступова інтэграваная група ператварылася ў спецгрупу.

«Любе не хапала зносін са звычайнымі дзецьмі — яе сябры ўжо вучыліся ў школе, — успамінае Дар'я. — Нашы выхавацелі таксама сышлі: адна ў дэкрэт, другая на пенсію. Новым выхавацелям, здавалася, нецікава працаваць з асаблівымі дзецьмі. Аднойчы ўвечары прыйшла па малую і ўбачыла, як яна адна сядзіць у кутку і размаўляе сама з сабой. Гэта было апошняй кропляй — я забрала яе з гэтай установы назаўсёды».

Але знайсці новую групу для Любы аказалася няпростай задачай. Дар'я размаўляла з загадчыцамі розных дзіцячых садкоў, але ёй усюды адмаўлялі. Тады жанчына звярнулася ва ўпраўленне адукацыі, і там ёй дапамаглі. Спецыяліст сама стала званіць загадчыцам і прасіць за дзяўчынку. І ў адным садку далі згоду, але толькі з выпрабавальным тэрмінам.

«На паводзіны Любы не было нараканняў. Калі ў інтэграванай групе з малой працаваў дэфектолаг, то ў новым садку такой раскошы не было, затое былі звычайныя дзеці і новыя сябры, — расказвае жанчына. — Яна займалася нараўне з ўсімі малымі, і толькі калі ёй было нецікава, то магла сысці. Але такое здаралася вельмі рэдка».

НОВЫЯ СЭНСЫ

Калі надышоў час ісці ў школу Любе, Даша была ўжо мамай трох дачок. За восем гадоў выхавання сваіх дзяцей жанчына стала сведкай, як вайбер-суполка з некалькіх сяброў — бацькоў дзетак з сіндромам Даўна пашырылася і стала аб'ядноўваць больш за дзве сотні чалавек па ўсёй краіне. Так нараджалася грамадскае аб'яднанне «Даўн. Сіндром. Інклюзія». Сёння жанчыны, якім паведамляюць аб тым, што ў іх народзіцца дзіця з сіндромам, адразу атрымліваюць інфармацыю аб гэтай арганізацыі. І калі жанчына звяртаецца сюды, то мае падтрымку ад сотні такіх жа бацькоў. Гэтага так не хапала самой Дар'і...

«Люба змяніла маё жыццё, — гаворыць яна. — Калі б мая старэйшая дачка нарадзілася без сіндрому, я б працавала эканамістам і ніколі не задумвалася б над тым, як неабходны спецыялісты-педагогі, якія любяць дзяцей і сваю работу. Менавіта ад такіх людзей залежыць, ці будзе шанц у дзіцяці з асаблівасцямі жыць у грамадстве. Я б ніколі не задумвалася, наколькі важная інклюзія і падтрымка бацькоў незвычайных малых. Мне не хочацца заставацца ўбаку, я хачу дапамагаць людзям».

Даша паступіла ў Інстытут інклюзіўнай адукацыі (пры БДПУ імя М. Танка) на спецыяльнасць «алігафрэнапедагогіка». Дарэчы, жанчыны, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, могуць паступіць на бюджэтную форму навучання, нават калі ў іх ужо ёсць вышэйшая адукацыя. Нягледзячы на тое, што Дар'я вучыцца толькі на першым курсе, яна ўжо знайшла сабе работу.

Шматдзетная маці ўпэўнена, што жанчына, якая мае дзіця з асаблівасцямі, заўсёды будзе запатрабаваная як спецыяліст у такой сферы, бо для яе гэта не проста работа, а асабісты інтарэс. Інтарэс быць карыснай.

«Лічбавае» пакаленне загаворыць па-беларуску

У інтэрнэт-прасторы выйшаў першы беларускамоўны падкаст для падлеткаў «Першыя». Яго стваральнікі прапануюць школьнікам цікавы інфармацыйна-адукацыйны кантэнт, які можа дапамагчы атрымаць дадатковыя веды ад аўтарытэтных экспертаў: лекцыі, гутаркі, інтэрв'ю, майстар-класы ў аўдыяфармаце.

Запланавана адмысловая серыя такіх выпускаў. Працягласць кожнага запісу — каля 20 хвілін. За гэты час прафесіяналы з розных сфер дзейнасці ў гутарцы з вядучым падкаста **Дзмітрыем СМІРНОВЫМ** на ўласным прыкладзе раскажуць пра тое, наколькі важна валодаць прамоўніцкім майстэрствам, каб увасобіць у жыццё свае ідэі. У якасці гасцей будуць запрашацца цікавыя асобы — вядомыя спецыялісты ў галінах экалогіі, культуры, інклюзіі, тэхналогій і майстэрства красамоўства.

У першым падкасце **Ірына ДУБОВІК** — CEO, Project Marketing, саветнік па развіцці бізнесу Intetics, сузаснавальніца акселератара StartUpON — расказвае, як пераадолець страх публічных выступленняў, данесці сваю задуму да аўдыторыі і захапіць слухачоў, якіх памылак варта пазбягаць і як рэагаваць на пытанні з залы.

Беларускамоўны падкаст для падлеткаў выйшаў у рамках сацыяльна-адукацыйнага праекта «Першыя», які рэалізуецца кампаніяй А1 пры падтрымцы арганізатараў канферэнцыі TEDxMinsk. Конкурс удзельнікаў стартаваў у кастрычніку.

— Сучасныя дзеці любяць тэхналогіі, любяць выступаць і дыскутаваць, — расказвае аб праекце «Першыя» **спецыяліст групы па карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці кампаніі А1 Кацярына СЕВАСЦ'ЯНЧУК.** — Мы разумелі, што недастаткова будзе зрабіць праект, у якім ёсць толькі лекцыі і выступленні ў школе. Нам хацелася вывесці нашых удзельнікаў на шырокую аўдыторыю, каб яны пастаялі ў «чырвоным крузе» і адчулі, як гэта — быць валанцёрам руху TEDx. Мы разумеем, што ўдзельнікі нашага праекта недасканала валодаюць беларускай мовай, таму заяўкі прымаем і на рускай мове. Але ўдзельнікаў выніковай канферэнцыі будзем рыхтаваць да выступлення на беларускай.

Кожны ўдзельнік конкурсу на працягу навучальнага года распрацоўвае сваю ідэю ў адным з чатырох кірункаў — экалогія, культура, інклюзія ці тэхналогіі. Патрабаванне да конкурсных прапаноў толькі адно — яны мусяць змяняць навакольны свет і жыццё да лепшага. Для ўдзелу ў фінале будуць адабраныя дзесяць старшакласнікаў.

Падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Асабістае

Гэта маміны рукі ратуюць мяне...

Так атрымалася, што крыху больш за два гады таму са мной здарылася няшчасце. Я перажыў інсульт. Кровазліццё ў мозг было не смяротным, але падзяліла маё жыццё канкрэтна на «да» інсульту і «пасля». Пашанцавала, што трапіў у бальніцу хуткай дапамогі, дзе мяне чатыры дні выходжвалі ў рэанімацыі. Потым два тыдні пракапвалі (прыводзілі ў кандыцыю галаву), вучылі хадзіць, есці, трохі гаварыць, а затым адправілі на месяц на рэабілітацыю ў Аксакаўшчыну (спецыялізаваны санаторый пад Мінскам).

З санаторыя я выйшаў амаль што новым чалавекам. Справа ў тым, што пасля перажытага «ўдару» мой слоўнікавы запас зменшыўся ў разы, а ў галаве ўтварыліся досыць вялікія кавалкі майго жыцця «без памяці». Калі са слоўнікавым запасам мы сумесна з санаторным лагапедам праблему вырашылі — мяне выдатна падцягнулі, то з памяццю ішло ўсё нашмат складаней. Апрыёры я ведаў, што жанаты, што ў мяне трое дзяцей, што старэйшую дачку клічуць Паліна. І... амаль усё на гэтым. Аб тым, што другую дачку завуць Насця, а сына Аляксей, расказала мне жонка. Яна ж нагадала, што яе завуць Святлана. «Гэтак жа, як маю маму?» — спытаў я. Маму я не забыўся. Усё, што датычылася бацькоў, — я памятаў.

Потым, пасля санаторыя, быў адпачынак. Гэты час я правёў на сваёй малой радзіме ў Ляхавічах, дзе зноў вучыўся ездзіць на ровары, збіраць грыбы, лавіць рыбу і... размаўляць з людзьмі. Гэта наўпрост датычылася маёй работы. Я, як вы разумееце, журналіст.

А размаўляць было цяжэй за ўсё. Не таму, што я тады стаў трохі заікацца, не. Галоўнае, трэба было спачатку скласці правільную фразу (сказ) у сябе ў галаве, і толькі пасля гэтага вымавіць яе ўслых. Паколькі я ў нашай газеце пішу ў асноўным пра эканоміку, мне трэба было складаныя рэчы «перакладаць» на даступную, чалавечую мову.

І тады я пачаў тлумачыць сваёй 80-гадовай маме складанасці карыстання банкаўскай карткай. Мілая мама, ты слухала мяне ўважліва — не перабіваючы, нічога не ўдакладняючы, толькі ў кутку тваіх вачэй блішчэлі слязінкі. І кожны раз, пасля нашых сумесных заняткаў, ты падыходзіла да мяне, абдымала маю галаву сваімі маленькімі далонямі і гладзіла па валасах шурпатымі рукамі.

А галоўнае, у нас усё атрымалася! У канцы адпачынку мама ўжо цалкам самастойна магла здымаць грошы ў інфакіёску, разлічвацца карткай ва ўсіх крамах, а я стаў досыць бегла і ўцямна гаварыць на часам заблытаныя тэмы.

...Прайшло два гады. Лекары сказалі мне, што працэс аднаўлення памяці пражытых перыядаў жыцця быў магчымы ў першы год непасрэдна пасля інсульту. Што не ўспомніў — значыць, не лёс. У мяне ў галаве адсутнічаў велізарны кавалак часу, майго часу — з 30 да амаль 50 гадоў. У маёй памяці захаваліся толькі ўспаміны пра апошні месяц напярэдадні інсульту, а што перад гэтым? Адрывістыя імгненні... Так было да цяперашняга лета...

А летам я зноў праводзіў свой адпачынак у Ляхавічах. Неяк раніцай мы разам з мамай рабілі дранікі. Я цёр бульбу, а матуля дадавала ў яе патрэбныя інгрэдыенты і чытала на памяць вершы Ясеніна. Я яе паправіў, і ў адказ яна весела паправіла мне прычоску. І тут у маёй галаве штосьці пстрыкнула — гэта памяць маю разбудзіў водар маладой бульбы ўперамешку з кісла-салодкім пахам мамчыных рук. Я ў адно імгненне ўспомніў цэлы пласт таго, што было згублена амаль назаўжды.

Аднаўленне памяці цяпер стала адбывацца вялікімі часткамі пад уздзеяннем новага, ці дакладней, забытага водару. Успамінаў такія падрабязнасці, якія і ў здаровым стане забываюцца ўжо праз тыдзень.

Мне 52 гады з хвосцікам. Цяпер я ведаю дакладна, калі і дзе мы пазнаёміліся са сваёй жонкай. Я памятаю ўсіх выкладчыкаў ва ўніверсітэце, усе бяссонныя ночы, калі ў дзяцей маіх рэзаліся зубкі. Я ўспомніў усё, і гэтая велізарная радасць — ведаць і ўсведамляць, што ні за адзін дзень пражытага жыцця табе не соромна.

Я ведаў, што дапамога прыйдзе. Насуперак усяму, нягледзячы ні на што. Трохі містыкі, беззапаветная вера ў маму і самаадданая яе любоў да мяне.

Сяргей КУРКАЧ.

«Я аптыміст па натуры»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Многія з такім дыягназам упадаюць у дэпрэсію, адчай. Як удалося застацца аптымістам?

— Не магу сказаць, што ад весткі пра хваробу ўпаў у роспач. На гэта ёсць некалькі прычын. Па-першае, я аптыміст па натуры. З дзяцінства навучыўся пераводзіць мінус у плюс! Гэта не пафігізм, а асаблівасць маёй свядомасці і псіхатыпу. У любой, нават суперскладаной сітуацыі, імкнуся знайсці і зачапіцца хай за маленькі, але плюсік, а затым максімальна сканцэнтравацца свядомасцю на ім. У прыватнасці, я пачаў разважаць прыблізна так: мне ПАШАНЦАВАЛА, што хвароба здарылася ў другой палове жыцця, а не ў першай; мне ПАШАНЦАВАЛА, што ў мяне Паркінсон, а не анкалогія; мне ПАШАНЦАВАЛА, што Паркінсон хоць і цяжкае, але не смяротнае захворванне і ў прынцыпе, калі не псіхаваць, да яго можна прыстасавацца і гэтак далей. Па-другое, я знайшоў справу па душы — захапіўся сталяркай... Без гэтага хобі сёння не ўяўляю свайго жыцця. Яно дапамагае мне пераадольваць наступствы хваробы.

— Джон Вайн у сваёй кнізе «Пагаворым пра хваробу Паркінсона» піша, што пацыенту Хэўману справіцца з цяжкай сітуацыяй дапамаглі не лекі, не трэніроўкі, не аперацыя, а сям'я. Прычым меў на ўвазе не толькі жонку, але і дзяцей — яны аказалі яму вялізарную падтрымку. Як змяніліся за апошнія гады вашы стасункі са сваякамі? Ці звярталіся вы ці яны да псіхолага па дапамогу?

— З сям'ёй і ўсімі маімі роднымі мне пашанцавала! Яны прынялі маю хваробу гэтак жа, як прыняў яе і я. Не было слёз, паказных перажыванняў — гэта было б найгоршае для мяне. Адчуваю тактоўную дапамогу і падтрымку з іх боку. А яшчэ выручаюць жарты! Так-так, менавіта жарты! Ну, напрыклад, я сам прыдумаў слоган: «Разам дружна мы жывём: Нэлі, я і Паркінсон!» (Нэлі — жонка Аляксандра Ксяневіча. — **Аўт.**) Што ж датычыцца дапамогі, то яна складаецца ў асноўным з цярплівага стаўлення да маіх рухальных асаблівасцяў: я павольна адзяваюся, павольна хаджу... Мае блізкія, ведаючы гэтую асаблівасць, не раздражняюцца, калі трэба пачакаць лішнюю хвіліну. Пры неабходнасці ненавязліва прапануюць дапамогу. Так што звяртацца да псіхолага ні мне, ні маёй сям'і не спатрэбілася.

— Як знайшлі справу па душы? Чаму выбралі менавіта шахматныя столікі, драўляныя календары?

— Неяк вырашыў зрабіць падстаўку пад свой айпэд. Атрымалася нядрэнна. Другім маім вырабам стаў шахматны столік. Ідэя зрабіць яго таксама ўзнікла выпадкова. Мы даволі часта гуляем з жонкай у шахматы. І калі робім гэта, седзячы на канапе, то дошку нязручна трымаць, — яна ўвесь час намагаецца саслізнуць на падлогу. Вось Нэлі і прапанавала зрабіць шахматны столік. Ні першы, ні другі блін камяком не сталі! Далей пайшлі новыя ідэі. Пад іх рэалізацыю пераабсталяваў палову лоджыі, купіў неабходны мінімум інструментаў і ў выніку большую частку актыўнага па стане хваробы часу праводжу ўдасканальваючы сталярныя навыкі.

Мае вырабы не абмяжоўваюцца шахматнымі столікамі і календарамі. Я перарабіў або відазмяніў вялікую частку хатняй мэблі. У маім «арсенале» — камоды, шафы, тумбачкі, табурэткі! Маштаб маёй сталярнай дзейнасці, на жаль, абмяжоўваецца памерамі балконнай міні-майстэрні (1 м х 2,7 м). Як сказаў персанаж адной старой добрай казкі: «Шкада, каралеўства замалое! Разгуляцца няма дзе!» Колькасна пераважаюць столікі і календары, таму што яны цудоўна падыходзяць у якасці падарунка. Увесну гэтага года я вырашыў пачаць бестэрміновую перманентную акцыю дарэння сваіх вырабаў. Ужо перадаў па адным шахматным століку з наборам шахматных фігур і шашак кожнай агульнаадукацыйнай школе горада Жодзіна, іх у нас восем, дзвюм гімназіям, Цэнтру дзіцячай творчасці, гарадской бібліятэцы, мастацкай школе, дзіцячаму садку. Цяпер запаўняецца спіс патэнцыйных атрымальнікаў падарунка на год наперад. Таксама на «ўра» разлятаюцца драўляныя календары. Прычым у спісе заказчыкаў на падарунак ужо ёсць установы не толькі майго горада, але і раёна. Гэта так важна — адчуваць сваю патрэбнасць людзям! І так прыемна бачыць захопленыя твары і чытаць удзячныя каментарыі ў «Аднакласніках».

— Чаму раздорваеце свае вырабы? Не было думкі прадаваць?

— Раптам разам з хваробай я адчуў вострае жаданне рабіць людзям добра і атрымліваю ад гэтага каласальнае задавальненне ды ... энергетычную падсілкоўку! Кожны падараны столік дорыць мне ў адказ

Ва ўсіх школах Жодзіна ў настаўніцкіх ёсць шахматны столік Аляксандра Ксяневіча.

крышачку новых сіл. А яшчэ я ўзяў шэфства над сваім пад'ездам. Мы з жонкай штомесяц частку пенсіі трацім на матэрыялы для рамонтных работ, і я сам іх выконваю.

— Раскажыце пра хваробу Паркінсона — як яе распазнаць, не прапусціць? Бо, калі шчыра, я ведала толькі пра сіндром дрыжачых рук, а як высветлілася, гэта нават не абавязковая прыкмета.

— Каварства хваробы Паркінсона ў тым што яна ўзнікае і развіваецца спадцішка. Калі вы пачынаеце прыкмячаць нядобрае, да гэтага моманту, на жаль, ужо загінула каля 80 % нейронаў, якія адказваюць за рухальную актыўнасць. Першыя прыкметы хваробы можа заўважыць толькі добры спецыяліст, але мы ж не пойдзем да неўролага без бачнай для нас прычыны. Вось у гэтым і пастка! Асаблівасць жа гэтай хваробы ў тым, што вылечыць ад яе, на жаль, пакуль нельга, але, чым раней пачаць прымаць медпрэпараты, тым павольней будзе працэс яе развіцця. Дрыжанне рук сапраўды зусім не абавязковая прыкмета! У маім выпадку трэмар амаль нулявы, затое ярка выяўлена рухальная пасіўнасць аж да «застывання» на адну-дзве хвіліны. У мяне ўжо салідны стаж хваробы — 13 гадоў пасля пастаноўкі дыягназу, і цяпер пасля прыёму лекаў я атрымліваю прыблізна гадзіну-паўтары нармальнай актыўнасці, рухаюся як звычайны чалавек. Затым зноў ступар. І так на працягу сутак з улікам перыядычнасці прыёму медпрэпаратаў сукупна ў мяне «набягае» каля чатырох-пяці гадзін нармальнага жыцця. Паверце, для чалавека з хваробай Паркінсона гэта самыя радасныя гадзіны, калі адчуваеш сябе звычайным і прыходзіць думка: а ці не сон твая хвароба? Вось гэты «жывы» час і запоўнены ў мяне сталярнымі работамі, зносінамі з роднымі, прыбіраннем дома, шпацырамі, рыбалкай. Калі стала складана хадзіць, набыў электрасамакат. Я, відаць, першы і пакуль адзіны пенсіянер у горадзе з хваробай Паркінсона, які катаецца на скутары!

Калі Аляксандру Ксяневічу стала цяжка хадзіць, ён асвоіў электрасамакат.

— Якую параду далі б нядаўна дыягнаставаным пацыентам?

— Спакой, толькі спакой! Не псіхаваць, не панікаваць. Вызначыць від лекаў (іх некалькі), падабраць правільную дозу і рэгулярна прымаць. Атрымаць магчымую маральную дапамогу сям'і. Бо сваркі, канфлікты ўскладняюць і пагаршаюць працяканне хваробы. І яшчэ вельмі важна запоўніць актыўныя гадзіны любімай карыснай справай. Хвароба Паркінсона нашмат лягчэй працякае на фоне пазітыўнага настрою. Пастарайцеся, каб ваша жыццё «пасля» было па магчымасці такім жа, як і «да»... Станьце героем у вачах блізкіх людзей! Хай вамі захапляюцца. Гэта лепш, чым сваім панурым выглядам засмучаць і раздражняць навакольных людзей або выклікаць у іх жаль. Калі ўсё ж такі здарыўся дрэнны настрой, не пераносьце яго на родных.

— Катрын Лаборд (аўтарка папулярнай кнігі «Дрыжыць» пра тое, як яна жыве з дыягназам Паркінсона) сказала: «Кніга дапамагае стварыць дыстанцыю паміж маёй хваробай і мной». Можа быць, вам таксама знаёмая кнігатэрапія?

— Мне дапамагае сацыятэрапія праз сацсеткі (Аляксандр Казіміравіч вядзе блог у «Аднакласніках». — **Аўт.**). Кнігатэрапія адняла б занадта шмат часу і перашкодзіла б майму сталярнаму хобі.

— Што вы зразумелі пра жыццё за апошнія 13 гадоў?

— Што жыццё кароткае... Таму стараюся кожную сваю актыўную гадзіну максімальна напоўніць карыснымі справамі. У мяне ёсць планер, куды штодня пішу, што павінен зрабіць абавязкова сёння, а што ў перспектыве. Планаванне дазваляе зрабіць маё жыццё максімальна насычаным і арганізаваным. Хвароба навучыла мяне цаніць час! Я вельмі хачу ў пакінутыя мне, спадзяюся, гады жыцця зрабіць як мага больш добрых спраў для людзей!

— Якое апошняе пытанне самі сабе задалі б?

— Калі б жыццё пачаць спачатку, штосьці ў ім памянялася б для вас?

— І адкажыце на яго.

— Паспрабаваў бы не здзяйсняць глупстваў, а яны, на жаль, у маім жыцці былі...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Кожны падарункавы «вечны» каляндар майстар аздабляе выявамі жывёл, з якімі чалавек сябе асацыюе. А апошнім часам і надпісам: «Сёння самы шчаслівы дзень у тваім жыцці». Застаецца паслухацца і пражыць так кожны новы дзень! На фота: сямейны каляндар Ксяневічаў: Аляксандр — кот Леапольд, Нэлі — белая варона.

40+

ПОЗНІЯ РОДЫ: ЗА І СУПРАЦЬ

...Мая знаёмая Наталля пасля таго як выйшла замуж, дзяцей заводзіць не спяшалася. Маладая сям'я жыла ў невялікай кватэры з бацькамі — не да малых, трэба было будаваць сваё жыллё. Праз некалькі гадоў, дачакаўшыся чаргі, пара нарэшце пераехала ва ўласную кватэру. Аднак тут Наталля аказалася на парозе кар'ернага скачка: у кампаніі, дзе яна працавала, вызвалілася пасада загадчыка юрыдычнага аддзела. На яе прэтэндавалі наша гераіня і яе значна старэйшы калега. Кар'ерную гонку Наталля выйграла і ўрэшце заняла пасаду. А калі, здавалася б, можна было і нараджаць, зацяжарыць так і не змагла. «Спачатку думала, што занадта рана, а потым стала позна», — кажа яна. Яе равесніцы Марыне пашчасціла больш. Яна таксама была засяроджана на кар'еры, а пасля 35 зразумела, што «жыць няма для каго». Але ў яе ўсё склалася больш удала: у 40 жанчына ўпершыню стала мамай. Цяжкая цяжарнасць і пастаянная пагроза выкідыша, месяцы «на захаванні», праведзеныя на бальнічным ложку, і заўчасныя роды — усе пакуты сёння нішто ў параўнанні з сэнсам яе жыцця — маленькай Веранікай, сцвярджае сама Марына.

З пункту погляду медыцыны, сёння познімі родамі лічацца першыя роды жанчыны, старэйшай за 35 гадоў. Але так было не заўсёды. Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя маладых мам, якія нараджалі дзіця пасля 24 гадоў, называлі старародзячымі. І гэта пры тым, што савецкім жанчынам удалося адсунуць планку дзетараджэння. Бо яшчэ раней лічылася, што дзяўчына пасля 20 гадоў... старая для цяжарнасці.

Сёння ўсё больш жанчын першае дзіця нараджаюць бліжэй да 30 гадоў. І беларускі тут не выключэнне. Атрымаць адукацыю, вопыт работы і падняцца па службовай лесвіцы, пападарожнічаць па свеце і пажыць для сябе, бо сямейныя клопаты — доля тых, каму за 30. Усё часцей сённяшнія дзяўчаты расстаюляюць прыярытэты менавіта так. Але познія роды могуць паўплываць на здароўе як будучай мамы, так і немаўляці. Здараецца, што ва ўзроставых матуль нараджаюцца дзеці з генетычнымі захворваннямі.

Аптымальны ўзрост — 21—35 гадоў

— Сучасныя жанчыны, на жаль, усё часцей абіраюць для сябе прыярытэтнымі мэтамі адукацыю, паспяховую кар'еру, дасягненне пэўнага матэрыяльнага дабрабыту, адкладваючы мацярынства. І не ўсе ўсведамляюць, што жаночы арганізм устроены такім чынам, што пасля 35 гадоў вычэрпваецца аварыяльны рэзерв яечнікаў. Пад гэтым тэрмінам маюць на ўвазе не толькі колькасць, але і якасць яйцаклетак, здольных да апладнення. Змяншэнне іх колькасці адбываецца з натуральных прычын ад моманту ўступлення ў рэпрадуктыўны ўзрост, — тлумачыць **урач-акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі Мінска, аспірант кафедры акушэрства, гінекалогіі і рэпрадуктыўнага здароўя Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святлана КРЭЕР.** — Таму аптымальным для нараджэння дзяцей лічыцца перыяд з 21 да 35 гадоў.

Пры гэтым ва ўсім свеце акушэры-гінеколагі прыйшлі да высновы, што найлепшым узростам для нараджэння першынца з'яўляецца 21—25 гадоў. У гэты час у арганізме аптымальны ўзровень эстрагенаў і прагестэрону. Косці таза ўмацаваліся і валодаюць дастатковай гнуткасцю. У яечніках вялікі аварыяльны рэзерв.

Нягледзячы на тое што па класіфікацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя рэпрадуктыўным лічыцца ўзрост да 49 гадоў, пасля 35 фертыльнасць (здольнасць да нараджэння) пачынае паступова зніжацца. А ўжо пасля 40 тэмпы згасання значна паскараюцца. І верагоднасць наступлення цяжарнасці ў гэтым узросце ў 2 разы ніжэйшая, чым у 20 гадоў!

Рызыка генетычных анамалій і іншыя

Акрамя гэтага, з 35 гадоў з'яўляюцца рызыкі нараджэння дзіцяці з генетычнымі анамаліямі, напрыклад сіндромам Дауна. Не сакрэт, што вялікай колькасці такіх дзяцей падарылі жыццё менавіта ўзроставыя матулі.

